МОСКВА 19
УЛ. ФРУНЗЕ 10 ИН.ТУТ
СОВ.СТРОИТ.И ПРАВА

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 33 (5707) | 10 лютага 1937 г., серада | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

АБ АЗНАМЕНАВАННІ СОТАЙ ГАДАВІНЫ З ДНЯ СМЕРЦІ НАЙВЯЛІКШАГА РУСКАГА ПАЭТА А. С. ПУШКІНА

ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА САЮЗА ССР

У азнаменаванне сотай гадавіны з дня смерці найвялікшага рускага паэта **А. С. Пушкіна**, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саюза ССР **пастанаўляе:**

1. Дзяржаўнаму музею выяўленчых мастацтваў у Маскве прысвоіць імя **А. С. Пушкіна.**
2. Перайменаваць вуліцу Бальшую Дзмітраўку ў **Пушкінскую** вуліцу.
3. Нескучную набережную Масква-ракі перайменаваць у **Пушкінскую** набережную.
4. Перайменаваць Останкіно ў Маскве ў **Пушкінскае.**
5. Перайменаваць г. Дзецкае село ў г. **Пушкін.**
6. Дзяржаўнаму ленінградскаму акадэмічнаму тэатру драмы прысвоіць імя А. С. **Пушкіна.**
7. Перайменаваць Біржавую плошчу ў г. Ленінградзе ў **Пушкінскую плошчу.**

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР
М. КАЛІНІН.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР
І. АКУЛАЎ.

Масква, Крэмль.
9 лютага 1937 г.

Вялікі паэт вялікага народу

Сто год таму назад царскі ўрад рукой чужаземнага авантурыста абарваў жыццё аднаго з вялічайшых сыноў вялікага рускага народу.

Стагоддзе з дня смерці Пушкіна ператварылася ў краіне перамогшага социялізма ў велічнае свята совецкай культуры. Юбілейныя дні народы Совецкага Саюза адзначаюць новым узлымам культуры. Мільёны рабочых і сялян асвойваюць культурную спадчыну, вывучаючы твораны вялікіх людзей. У СССР няма народу, які-б да юбілейных дзён не меў перакладаў твораў Пушкіна. Юбілей, аднак, мае і вялікае палітычнае значэнне.

Ворагі чалавецтва—фашысты паклёпнічаюць, быццам рускі народ не ўладае дзяржаўнымі дараваннямі, не здолен да культурнай і навуковай творчасці. Імя Пушкіна—жывое абвяржэнне гэтага нагла фашысцкага паклёпу. Вялікі рускі народ даў чалавецтву геніяльнага Пушкіна, таксама, як ён даў яму дзесяткі іншых геніяў—Ламаносава, Чарнышаўскага, Лабачэўскага, Менделеева, Паўлава, Горкага. Руская культура дасягла вышынь сусветных вяршынь у ленінізме—вучэнні і надзеі народаў свету.

Народ, які пад цяжкім памешчыцка-прыгонніцкім гнётам змог нараджаць такіх геніяў, як Пушкін,—вялікі народ, якому належыць пачэснае месца сярод перадавых народаў чалавецтва. Яго не могуць запалохаць паклёп і пагрозы фашысцкіх варвараў.

Рускі народ і разам з ім усе другія народы СССР у адзінай брацкай садружанасці, будуючы социялізм пад кіраўніцтвам слаўнай партыі Леніна—Сталіна, ушаноўваюць памяць вялічайшага сына рускага народу, якога праследаваў, цкаваў і, нарэшце, здрадніцкі забіў рускі царызм. Лёс Пушкіна нагадвае аб долі лепшых сыноў вялікага рускага народу пад уладай праклятага памешчыцка-буржуазнага ладу.

Пушкінскія юбілейныя ўрачыстасці паказваюць, як беражна адносіцца рабочы клас да культурнай спадчыны мінуўшых вякоў, як ён адбірае ў ёй лепшае і гэтым лепшым сябе абагачае. Пушкінскія ўрачыстасці яшчэ раз пераконваюць, што толькі рабочы клас зможа выратаваць чалавечую культуру ад той гібелі, якую нясе ёй агалцелы фашызм. Пушкін—частка гэтай чалавечай культуры, якую рабочы клас выратоўвае ад нявучэнных прапаведнікаў крывавых і брудных «расавых тэорый».

Пушкінскія ўрачыстасці паказваюць велізарны культурны рост совецкага народу, які так любіць, так ушаноўвае свайго Пушкіна. Пушкін адноўкава блізкі і дарагі кожнаму з народаў Совецкага Саюза, непарыўна звязаных паміж сабою ў працы і барацьбе непарушнай сталінскай дружбай.

Беларускі народ, атрымаўшы ў разультаце Вялікай Социялістычнай Рэволюцыі сваю дзяржаўнасць, магчымасць ствараць сваю нацыянальную па форме, социялістычную па зместу культуру,—з велізарнейшым узлымам адзначае стагоддзе з дня смерці геніяльнага рускага паэта.

Лепшыя вучоныя нашай рэспублікі чытаюць аб Пушкіне даклады, даследваюць яго творчасць. Акадэмія навук БССР правяла ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае Пушкіну, Лепшыя паэты БССР перакладаюць Пушкіна на беларускую мову. Нашы дзяржаўныя тэатры арганізуюць пушкінскія пастаноўкі. На фабрыках Менска, Віцебска, Гомеля, Магілева, Барысава створаны гурткі па вывучэнню Пушкіна. Рабочыя-стаханаўцы выступаюць з публічнымі дакладамі аб творчасці паэта. Калгасная беларуская вёска праяўляе да Пушкіна вялізны інтарэс—адбываюцца масавыя чыткі яго твораў, яго вобразы ўвасабляюцца народнай творчасцю.

Пушкінскія ўрачыстасці ператвараюцца ў нас у магутную дэманстрацыю інтэрнацыянальнай дружбы народаў.

Такое значэнне пушкінскага юбілею—вялікага свята народаў неасяжнага Совецкага Саюза.

Пушкін з'яўляецца тварцом рускай літаратурнай мовы, роданачальнікам новай рускай літаратуры, непараўнальным майстрам мастацкага слова. Пушкін, па выражэнню Максіма Горкага, «паэт да гэтага, дня нікім неперавышаны ні ў прыгожасці верша, ні ў сіле выражэння пачуцця і мысліі»... Да ўсяго гэтага трэба дадаць тыя рысы светапогляду Пушкіна, якія родняць яго з намі, набліжаюць яго да нас. Ад бадзёрага, жыццерадаснага пушкінскага аптымізма, ад яго свабодалюбівасці, ад яго творчай актыўнасці, ад яго атэізма, ад яго вялікай чалавечнасці, ад яго дэмакратычнасці, ад яго інтэрнацыяналізма цягнуцца жывыя ніці да социялістычнага чалавека сталінскай эпохі, якому гэтыя рысы зразумелы, блізкі і патрэбны.

Вось чаму совецкі народ называе Пушкіна **сваім, нашым.**

Вялікая Социялістычная Рэволюцыя пад геніяльным вадзіцельствам Леніна і Сталіна змяла той эксплаататарскі лад, які загубіў Пушкіна. Свабодныя народы нашай социялістычнай радзімы з павагай і любоўю ўшаноўваюць памяць свабодалюбівага паэта, геніяльнага мастака слова, ворага царскага самадзяржаўя і прыгонніцтва.



Александр Сергеевіч ПУШКІН. Партрэт работы мастака В. Трапініна (1827 г.).
Узноўлена з арыгінала, які захоўваецца ў Трэцьякоўскай галарэі.

Шлях выгнання

Памяці А. С. Пушкіна.

Я еду лесам, еду борам,
Гарыць на сонцы сіні лёд
Луізе высака ў прасторы
Жаданых мар імклівы лёт.

Мінаюць вёрсты. Як ніколі
Радуецца вабіць шырыня.
Прывет, аснежанае поле!
Прывет, марозны гоман дня!

Я праязджаю тым маршрутам
Праз беларускі лес-гушчар,
Якім, скаваўшы думу ў путы,
Паэта гнаў у ссылку цар.

Услед за геніем народа,
За ўзлётам гордых дум яго
Пар пасылаў таемным ходам
Жандара вернага свайго.

І між палёў, дубоў-сталетак
Каля празрыстага Дняпра,
Ляжаў выгнання шлях паэта
Па ўказу чорнага цара.

І Беларусь тады не знала,
Дзіво йшоў сярод яе палёў,
Бо на вачах яе ляжала
Іржа прыгонных ланцугоў.

З гор Магілёўшчыны ён бачыў
Народам выклятую даль.
Ён чуў, як край гаротны плача,
Як стогне плынь дняпроўскіх хваль.

І марыў ён — на першым дрэве
Павесіць лютага цара!
...Адначаваўшы ў Магілёве,
Далей пагналі песняра.

З тых дзён мінула ўжо стагоддзе...
Парос быллём выгнання шлях.
А песня генія ў народзе
Жыве ў раскованых грудзях!

Я еду лесам, еду борам,
Гарыць на сонцы сіні лёд.
Я сэрцам чую—над прасторам
Паэта славіць мой народ!

Андрэй АЛЕКСАНДРОВІЧ.

Люты, 1937.

ЛЮБІМЫ ПАЭТ

Люблю я Пушкіна за яго прыгожы чароўны верш. Люблю за яго багацце думак, за сюжэтнасць, за зразумеласць яго мовы для ўсіх ад малога да вялікага.

Яго песня ў маім юнацтве знаходзіць водгук у глухой забітай Беларусі. Мне помніцца песня «Гляжу я безумный на чорную шаль и хладную душу терзает печаль...».

Гэтую песню я чуў у Беларусі год 40 таму назад. І захапляючыся ёю, я не ведаў, што гэта песня А. С. Пушкіна.

Люблю я Пушкіна за яго гордасць, за свядомасць чалавечай дастойнасці. Пушкіна, акружанага прыдворнай камарыльяй. Ён смела бічаваў вершамі і эпіграмамі ўладальнікаў таго часу. Ён не баяўся цароў і генералаў. Ён пісаў супроць імператара і яго прыслужнікаў, пісаў шчыра-бунтарскі, не баючыся за сваё жыццё.

Люблю я Пушкіна за тое, што ў дэспатычным жандарскім акружэнні ён, адзінокі, быў страшным для царскіх сатрапаў. Імператар быў бяссільны са сваёй ахранай, прыдворнай гвардыяй і казематамі перад Пушкіным-паэтам. Вольнадумства Пушкіна было не толькі ў вершах і эпіграмах. Яго вольнадумства ішло ў ногу з дзекабрыстамі. Імператар, які загнаў на вечную катаргу — у Сібір лепшых барацьбітоў за свабоду—дзекабрыстаў, не пасмеў крануць безабароннага паэта. У цара хапіла храбрасці толькі спадзішка забіць вялікага песняра.

Я люблю Пушкіна за тое, што ён у дні вялікай сталінскай эпохі паўстаў, як жывы барацьбіт за свабоду, за шчасце чалавецтва. І калі сёння народы многамільённага СССР і ўсё праграсіўнае чалавецтва свету ўспамінае добрым словам памяць вялікага паэта, мне хацелася-б так пісаць як пісаў любімы мною А. С. Пушкін.

ЯНКА КУПАЛА.
Народны паэт БССР.

СЛЫХ ПРОИДЗЕ АБА МНЕ ПА ЎСЁЙ РУСІ ВЯЛІКАЙ...

Слух обо мне пройдет по всей Руси великой,
И назовет меня всяк сущий в ней язык,
И гордый внук славян, и финн, и ныне дикой
Тунгуз, и друг степей калмык.
И долго буду тем любезен я народу,
Что чувства добрые я лирой пробуждал,
Что в мой жестокий век восславил я свободу
И милость к падшим призывал.

Слых пройдзе аба мне па ўсёй Русі вялікай,
І назаве мяне пламён бяскрайні лік,
І горды ўнук славян, і фін, і сёння дзікі
Тунгуз, і стэпаў друг калмык.
І доўга буду тым прыязны я народу,
Што лірай добрыя пачуцці абуджаў,
Што ў век суровы мой уславіў я свабоду
І да гаротных літасць зваў.

Пераклаў на беларускую мову А. АЛЕКСАНДРОВІЧ.

Usłyszy o mnie Ruś, nie skryją mnie przed nikim,
Przez cały wielki kraj pobiegnie o mnie słuch:
Pozna mnie słowian wnuk, i tunguz, dotąd dziki,
I fin, i kałmuk, stepów druh.
I lud otoczy mnie pokoleń swych miłością,
Bo czucia dobre budził w nim mej liry głos,
Bo w swój okrutny wiek złożyłem hołd Wolności,
Bom dla upadłych łaskę niósł.

Z rosyjskiego przełożył **Włodzimierz Kowalski.**

דורך גאנץ ראסיי וועט אימנייג וועגן מיר א קלאנג א מילדער,
און ס'וועט מיך אנרופן א יעדער פאלק צוריק,
דאס שטאלצע אייניקל פון סלאוו, דער פין, און איצט דער ווילדער
טונגוס, דער פרענט פון סטעפעס, דער קאלמיק.
און לאנג וועל איך דעם פאלק דערמיט זיין טייער,
ווייל לידער מיין געוועקט געפילן גוטע האס,
ווייל איך מיין גרויזאמן יאהרהונדערט כ'האב געריפמט די פרייהייט
און פאר געפאלענע געבעטן גנאד.

יונדיש כ. מיים

ПРЫЁМ У таварыша М. М. ЛІТВІНАВА Ў ГОНАР МІНІСТРА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ ФІНЛЯНДЫІ п. ХОЛСЦІ

МАСКВА, 9 лютага. (ТАСС). 8 лютага народны камісар замежных спраў тав. М. М. Літвінаў даў абед у гонар міністра замежных спраў Фінляндыі п. Холсці, які знаходзіцца ў Маскве.

На абедзе прысутнічалі: народны камісар замежнага гандлю тав. А. П. Рэзенгольц, народны камісар фінансаў СССР тав. Г. Ф. Грынько. Намеснікі народнага камісара замежных спраў тт. Н. Н. Крэстінскі і Б. С. Стаманякаў, фінляндскі пасланнік у СССР барон Ір'е-Каскінен, паўпрэд СССР у Фінляндыі тав. Э. А. Асмус, дырэктар палітычнага дэпартамента міністэрства замежных спраў Фінляндыі п. Паюла, чыны фінляндскай місіі і адказныя супрацоўнікі НКЗС.

У часе абеду тав. Літвінаў звярнуўся да п. Холсці з наступнай прамовай:

ПРАМОВА ТАВ. ЛІТВІНАВА

З пачуццём вялікага задавальнення я вітаю Вас, пан міністр, ад імя Саюзнага ўрада і ад свайго ўласнага. Вітаю Вас, як першага міністра замежных спраў незалежнай Фінляндскай рэспублікі, наведаўшага нашу сталіцу.

Вашаму візіту, пан міністр, прыдае асаблівае значэнне гісторыя Вашай краіны. У былой царскай імперыі, якая лічылася турмой народаў, у тым ліку з самага рускага народу, свабодалюбівы і адзначаўшыся сваёй культурай фінскі народ асабліва адчуваў цяжар гнёту рускага парызма і яго палітыкі русіфікацыі і натуралізацыі, імкнуўся да свайго вызвалення. Рускі народ, у асобе яго найбольш рэволюцыйнай большэвіцкай партыі, горача спачуваў гэтаму вызваленчаму руху Фінляндыі. Са свайго боку і фінскі народ аказваў падтрымку гэтай партыі ў яе барацьбе супроць царскага самадзяржаўя. Большэвіцкая партыя змагалася не толькі супроць самадзяржаўя, але і супроць яго русіфікатарства і першая агаласіла права народаў на самавызначэнне. Было таму зусім натуральным, што калі над кіраўніцтвам гэтай партыі апынуўся вялікі Кастрычніцкі пераварот, адным з першых актаў Совецкага ўрада было прызнанне Фінляндыі ў якасці незалежнай суверэннай дзяржавы і сапраўды, калі фінляндскі сейм у снежні 1917 года абвясціў самастойнасць Фінляндыі, не прайшло і месяца, як гэты акт быў неадкладна зацверджан Совецкім урадам.

З таго часу Совецкі ўрад няўхільна імкнуўся да ўстанаўлення найбольш прыязных адносін з суседняй Фінляндыяй на аснове поўнай павагі яе незалежнасці, яе культуры, недатыкальнасці агульных граніц і непарушнага міру.

Гэта імкненне знайшло сваё выражэнне ў мірным дагаворы 1930 года, у пакце аб ненападзе 1932 года, у прадаўжанні яго ў 1934 годзе на 10 год і ў Лонданскай канвенсіі аб вызначэнні агрэсіі, ва ўсіх тых актах, пад якімі маюцца подпісы прадстаўнікоў совецкага і фінляндскага ўрадаў.

Разам з тым Совецкі ўрад рабіў усё ад яго залежнае для ўсебаковага развіцця эканамічных, роўна як і культурных адносін паміж Совецкім Саюзам і Фінляндскай рэспублікай.

Агульная дзейнасць Совецкага ўрада на міжнародным арэне па ўмацаванню ўсеагульнага міру, па арганізацыі сістэмы калектыўнай безапасенасці, па ўмацаванню павагі да міжнародных абавязацельстваў мела таксама мэтай узмацненне пачуцця безапасенасці як у вялікіх, так і асабліва ў малых народаў. Гэта дзейнасць паштурхоўваецца, на жаль, на ўпартае супроцьдзеянне іншых сіл, якія імкнуцца сарваць справу міру, імкнуцца ўвекавечыць інстытут вайны, адкрыта заяўляюць, што яны не мыслянь сабе цывілізацыі без узаемнага знішчэння народаў, якія выступаюць супроць роўнапраўя паміж вялікімі і малымі народамі, супроць права кожнага народу на самастойнае існаванне. Гэтыя сілы тым больш небяспечны, што яны маюць свае агентуры, сваіх прадстаўнікоў ва ўсіх краінах.

Я хачу верыць, пан міністр, што Ваш візіт з'яўляецца маніфестацыяй не толькі жадання ўмацаваць адносіны паміж нашымі дзяржавамі, але і разумення агульных мэтаў знешняй палітыкі Совецкага Саюза і спачування ім. А калі гэта так, дык Вашаму візіту суджана стаць не толькі важным этапам на шляху далейшага развіцця совецка-фінскіх адносін, але і аказаць паслугу справе ўсеагульнага міру.

Я хачу яшчэ выказаць сваё асабістае задавальненне тым, што я прымаю фінляндскага міністра замежных спраў у асобе чалавека, якога я здаўна маю прыемнасць асабіста ведаць і з якім я шмат разоў сустракаўся ў Жэневе. Я ведаю, пан міністр, як глыбока Вы прасякнуліся за час свайго доўгагадовага прабывання ў Жэневе ідэямі Лігі нацый, тымі ідэямі, якія Совецкі ўрад жадае бачыць магчыма паўней рэалізаванымі. Гэта дае мне лішнюю падставу выказаць упэўненасць у тым, што пад Вашым кіраўніцтвам, пан міністр, знешняя палітыка Фінляндыі ўсё больш будзе кантактаваць са знешняй палітыкай Саюза ў агульным абодвум дзяржавам імкненні да міру.

Я падымаю бакал за трывалыя і прыязныя адносіны паміж нашымі дзяржавамі, за працвітанне фінскага народу, за здароўе главы Фінляндскай рэспублікі і нашых дарагіх гасцей, пана міністра і яго супругі.

З адказнай прамовай выступіў пан Холсці.

ПРАМОВА п. ХОЛСЦІ

Пан народны камісар замежных спраў!

Дазвольце горача падзякаваць Вас за аказаны мне сардэчны прыём, а таксама за тыя любезныя словы, з якімі Вы звярнуліся ў Вашай прамове да маёй краіны і да мяне асабіста.

Як Вы гэта ўжо адзначылі, візіт, які я маю гонар рабіць у старым горадзе Маскве, так багатым гістарычнымі ўспамінамі, сапраўды з'яўляецца асаблівым у тых адносінах, што гэта першы візіт міністра замежных спраў незалежнай Фінляндыі, які з'яўляецца афіцыяльным прадстаўніком свайго ўрада, у сталіцу нашага вялікага суседа. Я шчаслівы, пан народны камісар, што мог скарыстаць Ваша любезнае запрошэнне, і я спадзяюся, што ў часе майго прабывання ў Маскве мы будзем мець выпадак сумесна абмеркаваць пытанні, якія цікавяць нашы краіны.

Як Вы жадалі адзначыць, пан народны камісар, нашы ўрады, з часу абвяшчэння незалежнасці Фінляндыі, заключылі вялікую колькасць дагавораў, у мэтах урэгулявання ўзаемаадносін на аснове пастаяннага і цвёрдага добрасуседства. Совецкая Расія першая прызнала гэту незалежнасць. Нельга не ўпамянуць аб тым, што сам Уладзімір Ільіч Ленін асабіста ўручыў пану Свінхувуду — аднаму з найбольш выдатных у гісторыі Фінляндыі палітычных дзеячоў і цяперашняму прэзідэнту рэспублікі — дакумент аб прызнанні незалежнасці Фінляндыі.

Мірны дагавор 1920 года стварыў, у сваю чаргу, аснову для далейшага развіцця нашых палітычных і эканамічных адносін. Я горача спадзяюся, што, ла яльна прытрымліваючыся такім чынам устаноўленых прынцыпаў і шчыра імкнучыся развіць іх практычнае прымяненне, мы прыдзем да ўстойлівай згоды па ўсіх пытаннях, якія ў выніку нашага суседства прадстаўляюць для нас узаемную, першаступенную важнасць.

Само сабой зразумела, што, як Вы ўжо гэта канстатавалі, падтрыманне міру з'яўляецца неабходнейшай умовай для пладатворнага супрацоўніцтва не толькі паміж нашымі двума краінамі, але і паміж нашымі ўсяго земнага шара.

Вы, пан народны камісар, асабіста адыгралі актыўную і выдатную ролю ў гэтым сэнсе. На працягу многіх год я меў выпадак пастаянна канстатаваць у Жэневе, з якім інтарэсам і энергіяй грымалі Вы ўдзел у дзейнасці Лігі нацый, накіраванай да пралухілення вайны і кансалідацыі доўгага міру.

Фінляндыя ў сваёй скромнай частцы заўсёды поўнасцю падтрымлівала гэтыя намаганні. Гістарычнае мінулае Фінляндыі поўна войн і пакут. Іменна таму фінляндская нацыя горача імкнецца да таго, каб у свеце стварыліся такія знешнія ўмовы, якія маглі-б гарантаваць падтрыманне ўсеагульнага міру і якія адзіназдольны забяспечыць народам мірнае развіццё як у культурных, так і ў матэрыяльных адносінах.

Іменна таму Фінляндыя са свайго боку імкнецца падтрымліваць усімі сродкамі добрыя адносіны з усімі нацыямі, а ў асаблівасці з яе ўласнымі суседзямі.

Пан народны камісар, абетзве нашы краіны з'яўляюцца членамі Лігі нацый, статут якой служыць цвёрдай асновай для супрацоўніцтва паміж нацыямі, у мэтах падтрымання ўсеагульнага міру. Як Вы ведаеце, Фінляндыя заўсёды падтрымлівала ўсе намаганні гэтай міжнароднай арганізацыі, накіраваныя да ўмацавання міру і ўмацавання калектыўнай безапасенасці.

Я падымаю свой бакал за працвітанне ўсіх народаў і ўсіх нацыянальнасцей Саюза ССР і за здароўе старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта пана Калініна, а таксама за Ваша здароўе, пан народны камісар, і за здароўе пана Літвінавай.

Пасля абеду адбыўся прыём, на якім прысутнічалі члены дыпламатычнага корпуса, маршалы Совецкага Саюза тт. А. І. Егораў і С. М Будзённы, флагман флота першага ранга тав. В. М. Орлоў і камандарм другога ранга тав. Я. І. Алкснис, асобы вышэйшага камандзнага і начальніцкага складу РСЧА, кіраўнікі совецкіх устаноў і прадстаўнікі совецкай грамадскасці.

Пушкін і Пушчын у сяле Міхайлаўскім. З карціны Ге.

ШЛЯХ ЖЫЦЦЯ І ТВОРЧАСЦІ
(АСНОУНЫЯ ДАТЫ)

1799. 6 чэрвеня (26 мая па старому стылю) у Маскве ў доме па Нямецкай вуліцы нарадзіўся Александр Сергеевіч Пушкін.

1811. Пушкін паступіў у Царскасельскі ліцэй — закрытую навучальную ўстанову для дзяцей хваран у Царскім (зараз Дзецкім) сяле. Ён жыва цікавіцца палітычнымі падзеямі эпохі, чытае «вольную» літаратуру, знаёміцца з Чаадаевым, сябруе з будучымі дзекабрыстамі Пушчыным і Кюхельбекерам. Такім чынам складваўся светапогляд паэта. Тут развіваецца яго літаратурнае дараванне.

1815. Пушкін на публічным экзамене ў ліцэі, у прысутнасці Дзержавіна, чытае верш «Воспоминание о Царском селе».

1820. У сакавіку ён заканчвае сваю першую вялікую паэму «Руслан і Людміла», якая зрабіла вялікае ўражанне: у ёй адчуваліся дэмакратычныя ноты. Сярод твораў, напісаных Пушкіным, якія распаўсюджваліся ў рукапісах, былі ўжо вершы, заклікаўшыя да барацьбы з самаўладна-прыгонніцкім рэжымам («Вольность», «Деревня», «К Чаадаеву» і інш.).

6 мая ўрад высылае Пушкіна за «вольналюбівыя вершы» з Пецербурга ў Екацерынаслаў у распараджэнне ген. Інзова. Пушкін захварэў. Адзінокага, без догляду выпадкова знайшла яго сям'я ген. Раеўскага, якая ехала на Каўказ. Яны, атрымаўшы дазвол, узялі хворага з сабою.

Верасень. Пушкін пераязджае ў Кішынёў, куды пераведзена канцылярыя ген. Інзова.

1821. Заканчвае паэму «Кавказский пленник», «Братья разбойники» і «Гавриилиаду». Ён захапляецца творчасцю Байрона, які меў вялікі ўплыў на маладога Пушкіна. У Кішынёве паэт горача запікавіўся нацыянальна-вызваленчым рухам у Грэцыі і Іспаніі. Ён сходзіцца з членамі «Южного общества» дзекабрыстаў, піша рэволюцыйны верш «Кинжал».

1823. Пушкін пераведзен у Одэсу пад начальства самадура і бюракрата графа Варанцова. Свабодалюбівы паэт не спадабаўся Варанцову. Апошні ўсяляк прыгнятаў Пушкіна, пісаў даносы ў Пецербург і дамогся таго, што Пушкін быў высланы ў с. Міхайлаўскае, Пскоўскай губерні.

1824. Жнівень. Пушкін прыбыў у маёнтак бацькоў — с. Міхайлаўскае. Ён больш блізка вывучае жыццё рускага народу і народную паэзію. Тут ён заканчвае «Цыганы», піша гістарычную трагедыю «Борис Годунов», паэму «Граф Нулин» і некалькі раздзелаў рамана «Евгений Онегин».

1826. Верасень. Пасля паўстання дзекабрыстаў высветлілася, што творы Пушкіна адыгрывалі вялікую агітацыйную ролю ў арганізацыі паўстання. Нікалай I загадаў прывезці Пушкіна з Міхайлаўскага да сябе ў Маскву. Ад Пушкіна патрабавалі рабскага навінавення, да яго прыставілі цэнзара-жандара Бенкендорфа.

1827. У Сібір едзе жонка дзекабрыста А. Г. Мураўёва. З ёю Пушкін адпраўляе вядомы верш «Послание в Сибирь» і вершы Пушчыну.

1829. Паездка на Каўказ у дзейнічаючую армію, дзе было многа разжалаваных у салдаты дзекабрыстаў.

1830. Верасень. Пушкін прыязджае ў вёску Болдзіна, Нижагародскай губ. Ён вельмі многа працуе. Тут ён закончыў «Евгений Онегин», напісаў «Повести Белкина», «Скупой рыцарь», «Моцарт и Сальери», «Каменный гость» і шмат іншых твораў.

1831. Люты. Пушкін ажаніўся на Наталі Ганчаровай і хутка пераехаў у Пецербург.

1833. Лідзень—верасень. Пушкін стаў вывучаць архіўныя справы аб паўстанні Пугачова і набываў на месцы дзеянняў (Усходняя Расія). Ён сабраў багацце матэрыял аб паўстанні і напісаў «Историю Пугачева» і «Капитанскую дочку».

Снежань. Пушкіну «пажалавалі» званне камер-юнкера — новае праўленне здзекаў цара над паэтам, бо гэта званне давалася арыстакратычным юнакам, а Пушкіну было 35 год.

1836. Выходзіць першы нумар выдаваемага Пушкіным часопіса «Современник».

1837. Пад паэтам усё больш і больш згусціліся хмары нянавісці і злобы прыдворных служак. Яны стварылі і падагрэлі канфлікт паміж Пушкіным і Дантэсам. 8 лютага (27 студзеня на старому стылю) адбыўся паядынак паміж Пушкіным і Дантэсам. Паэт быў смяртэльна ранен.

10 лютага ў 2 гадзіны 45 мінут дня геній рускай літаратуры — А. С. Пушкін — памёр.

ЖЫВОМУ ПУШКІНУ

Ноч была, як цёмны лес, глухая,
Не палохаў вецер цішыні.
Гэтай ноччу над суровым краем
Нават зоры гаслі ў вышыні.
Снег і снег.
Сумёты па-калена,
Замяло дарогі ў палях.
Коні захлыналіся ад пены...
Гэта быў яго апошні шлях.
Ён ляжаў халодны пад саломай
У глыбокім, у смяротным сне, —
Чалавек, які не знаў утомы,
Чалавек, што песнямі звіней.
Ён за ўзлёт арлиных песень смелых,
У якіх
Ўзыходзіла зара, —
Быў прабіты кулай ашалелай
Па загаду тайнаму цара...
Гнаў жандар.
Ажно хрыпелі коні.
На санях падскоквала труна.
Гнаў жандар,
як быццам ад пагані,
Толькі й чуўся свіст ад бізуна...
* * *
Ён жывы прыйшоў к нам
праз стагодзе,
Ён любімым песняром нам стаў.
І спяваюць песні ў паводзе
тыя, што калісь паэт складаў.
Вечарамі, на заводскай сцэне
Пушкінская Тапа ўстае,
Льецца горным ручаём
праз сцены
Голас пералічаты яе.
Летнім ранкам
выйдзі ты на поле,
дзе шумяць вясёла класы, —
там спяваюць аб шчаслівай долі,
аб якой паэт калісьці сніў.
Льюцца песні над раздзімай вольнай,
Мы вялікі адчынілі свет
І, злаецца, разам з намі сёння
Запявае сонечны паэт, —
Бачыць ён, жывы і кучаравы,
Маладога племені расцвет.
Пра яго ляціць далёка слава
І яму гаворым мы —
прывет!

ЭДЗІ АГНЯЦВЕТ.

Люты, 1937 г.

К ЯМУ НЕ ЗАРАСЦЕ НАРОДНАЯ ТРАПА

З1 студзеня ў газеце «Звязда» быў надрукаван артыкул «За што мы любім А. С. Пушкіна», у якім рэдакцыя прасіла сваіх чытачоў выказаць думкі аб Пушкіне і яго творчасці. На зварот рэдакцыі адгукнулася шмат чытачоў. З усіх куткоў Совецкай Беларусі ідзе ў рэдакцыю паток пісьмаў. Рабочыя, калгаснікі, студэнты, слухачы, хатнія гаспадыні, вучні, настаўнікі — усе пішуць аб тым, што Пушкін—любімейшы паэт, творы якога яны чытаюць, вучаць напамяць, якога любяць за выдатныя раманы, чаруючую паэзію, ядавітую сатыру.

Настаўніца лёзнянскай рускай НСШ т. Хадаранка любіць Пушкіна за тое, што творы паэта — гэта чаруючы квітнеючы сад паэзіі і музыкі, зайшоўшы ў які,не хочацца выходзіць, дакуль не даведаешся, не пазнаеш усё хараство. Барысенка, майстар новабеліцкага жэвзаапрацоўчага камбіната імя Н. Ф. Гікало, гаворачы аб Пушкіне, кажа: «Пушкін — мой любімы паэт. Я люблю яго за прыгожыя словы, музычнасць яго вершаў. А які багаты змест яго твораў! Чытаю Пушкіна і адчуваю ўзбагачэнне сваёй мовы».

Аб сваім першым знаёмстве з творчасцю Пушкіна, піша нам чытач бібліятэкі менскага клуба работнікаў дзяржгандлю т. Брудзер: «Першая кніга, якую я прачытаў, навучыўшыся чытаць, гэта была «Сказки и стихотворения» Пушкіна. Цяжка выказаць тую любоў да паэта, якая ахапіла мяне, чытаючы гэтыя цудоўныя, простыя да разумення і надзвычайна прывабныя радкі. Творы Пушкіна сталі спадарожнікам майго жыцця. Я не ведаю лепшых вершаў, чым «Послание к Чаадаеву», «Деревня», «Памятник». За гэта я і люблю Пушкіна». Аналагічны ліст даслаў настаўнік ланьшынскай НСШ, Мсціслаўскага раёна, Дворнікаў, які ўпершыню з Пушкіным таксама пазнаёміўся толькі навучыўшыся чытаць. Ён пасля перачытваў творы паэта некалькі разоў. Пушкіна ён любіць і цэніць за высокую мастацкасць, за жывыя малюнкі, якія прадстаўляюцца перад ім пры чытанні твораў вялікага паэта. Сваю любоў да Пушкіна ён прывівае сваім вучням і таму не выпадкова, што на пытанне, пастаўленае вучням першага класа, кім яны хочуць быць адзін, засароміўшыся, сказаў:

— Пушкіністам...

Работніца магілёўскай фабрыкі штучнага валакна Тамара Енушкова піша, што калі-б ёй паставілі пытанне, чым ёй асабліва дораг Пушкін, яна-б прама адказала: усім. Яна любіць Пушкіна за тое, што ён сваімі геніяльнымі творамі заражае жыццёрадаснасцю, весялосцю, жаданнем змагацца, перамагаць і любіць. На вечары самадзейнасці, які адбудзецца ў пушкінскія дні, Тамара прачытае верш Пушкіна «Письмо к Чаадаеву».

Дзевяць чытачоў бібліятэкі Сенненскага раённага дома соцкультуры даслалі ў рэдакцыю свае заўвагі аб творчасці Пушкіна. Яны ўсе вельмі любяць чытаць творы Пушкіна. Ім дораг Пушкін за яго заклікі да жыцця і барацьбы, за лёгкасць чытання, маляўнасць і свежасць верша, за рэалістычнасць яго твораў, за цікавасць зместу, за прастату мовы. Кіраўнік драмгуртка т. Камінецкі піша, што «чытаючы Пушкіна, хочацца жыць, працаваць, таварыщ».

За народнасць мовы, за музычнасць яе любяць і чытаюць Пушкіна рабочыя завода імя Молатава С. Катушырка і завода «Чырвоны золак» Т. Ігнатовіч.

Студэнт ВКСГШБ (Вышэйшай комуністычнай сельскагаспадарчай школы Беларусі імя Леніна) Уладзімір Кучар піша: «Пушкін, з якім я пазнаёміўся яшчэ ў пачатковай школе, вырас для мяне у гігантскім выглядзе ў сценах ВКСГШБ. Я пачуў яго дыханне, адчуў сваім плячом цяплыню яго пляча, як-бы прыпаў вухам да грудзі вялікага паэта. Пушкін і цяпер яшчэ жыве таму, што толькі ў наш век, калі краіна «закаранелага рабства» ператварылася ў квітнеючы сад чалавецтва, абагрэты мудрасцю і загрэвасмы любоўю вялікага Сталіна, толькі ў наш век літаратура стала «патрэбнасцю народнай» і Пушкін, роданачальнік новай рускай літаратуры, як мудра назвалі яго наша партыя і ўрад, праз сто год пасля сваёй смерці стаў яшчэ больш жывым, яшчэ больш вялікім, яшчэ больш бессмяротным. За гэта я і люблю Пушкіна».

Нашага 15-гадовага чытача Сцяпана Чэропка з калгаса «Рассвет», Асіпавіцкага раёна, больш за ўсіх прачытаных пісьменнікаў хвалюе Пушкін. Ён прачытаў «Деревня», «Сибирь», «Чаадаев», «Цыганы», «Евгений Онегин» і інш. Сцяпан любіць Пушкіна ўсім сваім юнацкім сэрцам за высокамастацкія вобразы, за багатую і маляўнічую мову. Ён абяцае поўнасцю прачытаць творы Пушкіна.

«Прыпамінаецца маленькі стары домік, які ў час моцных вятроў трасся на сваіх ножках, і я пад шум ветра распяваў:

«То как зверь она завоет,
То заплачет, как дитя».

— піша чытач бібліятэкі менскага клуба работнікаў дзяржгандлю С. Эвенчык. Пушкін пазнаёміў яго з рускай мовай, з рускай культурай, бытам і гісторыяй. Цудоўная мова, паэтычная сіла! Пушкін яго лепшы друг у жыцці. За гэта ён і любіць Пушкіна.

Споўнілася 100 год з дня смерці вялікага рускага паэта Александра Сергеевіча Пушкіна, роданачальніка рускай літаратурнай мовы, узбагаціўшага ўсё чалавецтва неўміручымі творамі мастацкага слова. Толькі зараз Пушкін устае перад намі, як жывы, ён становіцца сапраўды ўсенародным паэтам. Пушкін жыве сваімі неўміручымі творамі, Пушкін жыве ў сэрцах прапоўных, якія любяць яго, якія чытаюць яго. Імя Пушкіна з любоўю паўтарасецца ва ўсіх кутках нашага неабсяжнага шматнацыянальнага Совецкага Саюза. Пушкіна перакладаюць і чытаюць на сваіх родных мовах усе народы Совецкага Саюза.

І праў быў Пушкін, калі пісаў:

«Я памятник воздвиг себе нерукотворный,
К нему не зарастет народная тропа».

Так, трапа не зарасла, наадварот, на гэтую трапу з кожным днём выходзіць усё больш і больш людзей. Гэта сотні тысяч, мільёны чытачоў, якія любяць, цэняць і чытаюць Александра Сергеевіча Пушкіна.

МЕЛЬЦЫН.

НАШ ПАЭТ

«...Не даром жизнь и пира
Мне были вверены судьбой».

Такі надпіс чытаем [illegible] на бронзавай медалі, выпушчанай [illegible] урадам 26 мая 1899 года ў знак [illegible]годдзя са дня нараджэння найвялікшага паэта.

Чаму-ж «не даром»?

Царызм, схаваўшыся за шматкроп'е, баяўся даць адказ на гэтае пытанне. Царызм, які любіў хаваць пад цэнзурнае шматкроп'е палымнеючыя думкі найлепшага чалавека мінулага стагоддзя, не спыніўся і перад тым, каб ганебна, варварскі палмяніць агнявыя словы паэта, яго заклікі да свабоды, самадзяржаўна-цэнзарскай адсябшчынай.

Я маю па ўвазе фальсіфікацыю чатырох радкоў пушкінскага верша на помніку паэту ў Маскве.

А ці толькі гэтыя радкі былі фальсіфікаваны? У школах, у бібліятэках падсоўвалі нам «апрацаванага» Пушкіна, стараючыся прадставіць яго нам толькі цілім песняром лірычных пейзажаў, мірнага кахання, апявальнікам мудрасці і вялікасці цароў, мізэрнасці чалавека перад тварам усявышняга і т. д. і т. п. Усё рабілася для таго, каб схаваць ад народу сапраўднага Пушкіна, замаскаваць паэта ў неўласцівыя яму адзенні ідэйнага і пачуццёвага вегетарыянца.

І тут прыгадваецца мне адна з баек Крапівы пра асла, які надумаўся вушамі сваімі закрыць сонца. Гэтай жывёліне быў падобны царызм у адносінах сваіх да паэта.

Як вядома, асёл са сваёй задачай не справіўся: сонца свяціла, свеціць і будзе свяціць...

Мы горача любім Пушкіна за музыку песенных слоў, за глыбіню пачуццяў, за многаколернасць лірычных сугуччаў яго верша, за дзівосную фантастыку казак, за крышталёвую чыстату і прастату яго слова. Ад раннягa дзяцінства, ад радкоў «шалун уж заморозил пальчик», «что ты ржешь, мой конь ретивый», «буря мглою небо кроет», «прибежали в избу дети», праз дзівосныя казкі «У лукоморья дуб зелёный» — пераходзілі мы да асваення «Узника», «Пророка», адсвойвалі вяршыні пушкінскай паэзіі ў «Барысе Гадунове», у «Еўгеніі Онегіне» і іншых творах паэта. І з кожным годам шырэй і шырэй разгортваліся перад намі чаруючыя сады хвалюючай пушкінскай паэзіі, ва ўсёй красе ўставаў перад намі ні з чым непараўнаны размах свабодалюбівай думкі паэта.

«На лире скромной, благородной
Земных богов я не хвалил:
И силе, в гордости свободной,
Кадилом лести не кадил.
Свободу лишь учася славить,
Стихами жертвуя лишь ей,
Я не рожден парей забавить
Стыдливой музою своей.
... Хочу воспеть свободу миру,
На тронах поразить порок.
... Тираны мира! Трепещите!
А вы, мужайтесь и внемлите,
Восстаньте, падшие рабы!

За гэтыя радкі мы асабліва любім і паважаем Пушкіна, як паэта, які здолеў выказаць у цяжкія рабскія гады найлепшыя думкі, найлепшыя мары многамільённага народу аб сваёй долі, аб свабодзе.

Вось чаму шануем і любім мы Пушкіна, вось чаму неаддзялімы ён і яго творчасць ад лёсу вялікага і гераічнага народу, здзейсніўшага самыя сукрытыя, вольналюбівыя думкі паэта, народу, будуючага цяпер сапраўднае шчасце чалавецтва.

МІХАСЬ ЛЫНЬКОЎ.

Дзекабрысты — знаёмыя і прыяцелі А. С. Пушкіна. НА ЗДЫМКУ ў верхнім радзе (злева направа): К. Ф. Рылееў; Пушкін сярод дзекабрыстаў; С. І. Мураўёў-Апостал. У ніжнім радзе (злева направа): П. І. Пестэль, П. Г. Каховскі і М. П. Бестужаў-Румін.

Праф. М. НЕЧКІНА

ПУШКІН І ДЗЕКАБРЫСТЫ

Гісторыя тайных таварыстваў дзекабрыстаў і іх выступленне супроць царскай улады са зброяй у руках прыпадае якраз на эпоху, у якую жыў Александр Сергеевіч Пушкін. «Я быў у сувязі амаль з усімі і ў пярэпісцы з многімі са змоўшчыкаў», — пісаў Пушкін свайму прыяцелю Вяземскаму 10 ліпеня 1826 года. Аб факце блізасці Пушкіна з дзекабрыстамі, аб іх прыязных адносінах было вядома даўно. Але дарэволюцыйныя даследчыкі не маглі і не хацелі ўскрыць усю глыбіню ўзаемаадносін Пушкіна і дзекабрыстаў, якая даступна толькі нашаму часу.

Пушкін не быў дзекабрыстам, але гісторыя яго палітычнай свядомасці цесна звязана з дзекабрыстамі, і яго рэволюцыйныя вершы адыгралі вялікую ідэалагічную ролю ў снежаньскім руху.

У аснову ацэнкі палітычных поглядаў Пушкіна павінна быць пакладзена ацэнка, даная Леніным руху дзекабрыстаў у цэлым. Ленін пачынае дзекабрыстамі гісторыю рэволюцыі. Ён дае ім ганаровае імя рэволюцыянераў і адначасова дае класавае вызначэнне іх рэволюцыйнасці: дзекабрысты — дваранскія рэволюцыянеры. У сваім артыкуле «Памяти Герцена» Ленін пісаў: «Шануючы Герцэна, мы бачым ясна тры пакаленні, тры класы, якія дзейнічалі ў рускай рэволюцыі. Спачатку — дваране і памешчыкі, дзекабрысты і Герцэн. Вузкі крыт гэтых рэволюцыянераў. Страшэнна далёкі яны ад народу. Але іх справа не загінула. Дзекабрысты разбудзілі Герцэна. Герцэн разгарнуў рэволюцыйную агітацыю.

Яе падхапілі, пашырылі, узмацнілі, загартавалі рэволюцыянеры-разначынцы пачынаючы з Чэрнышэўскага і канчаючы героямі «Народнай волі». Шырэй стаў круг змагароў, бліжэй іх сувязь з народам. «Маладыя штурманы будучай буры» — называў іх Герцэн. Але гэта не была яшчэ сама бура.

Бура гэта — рух саміх мас. Пролетарыят, адзіны да канца рэволюцыйны клас, узняўся на чале іх і ўпершыню ўзняў да адкрытай рэволюцыйнай барацьбы мільёны сялян. Першы націск буры быў у 1905 годзе. Наступны пачынае расці на нашых вачах» (Ленін, твор, т. XV, стар. 468—469).

Ленін указвае на класавую абмежаванасць дваранскай рэволюцыйнасці: ёй уласціва боязнь масавага руху, «сялянскага бунту», тактыка ваеннай рэволюцыі. Але гэта быў першы рэволюцыйны рух супроць царызма — не стыхійны, а арганізаваны і асветлены палітычнай свядомасцю. «У 1825 годзе Расія ўпершыню бачыла рэволюцыйны рух супроць царызма» — гаварыў Ленін у Цюрыху рабочай моладзі ў 1917 годзе ў дакладзе аб рэволюцыі 1905 года (твор, т. XIX, стар. 348). Ленін лічыў, што мы павінны ганарыцца дзекабрыстамі. У 1914 годзе ў артыкуле «Аб нацыянальнай гордасці вялікарусаў» Ленін пісаў: «Нам бальней за ўсё бачыць і адчуваць, якім гвалтам, гнёту і здзекам падвяргаюць нашу выдатную радзіму царскія каты, дваране і капіталісты. Мы ганарымся тым, што гэтыя гвалтоўніцтвы выклікалі адпор з нашага асяроддзя, з асяроддзя вялікарусаў, што гэта асяроддзе высунула Радзішчава, дзекабрыстаў...» (Твор. т. XVIII, стар. 81).

Яшчэ ў ліцэі Пушкін знаходзіўся ў прыязных адносінах з многімі будучымі дзекабрыстамі. Уплыў лекцый вольналюбівага Куніцына сказаўся на Пушкіне і на радзе будучых дзекабрыстаў. У год сканчэння ліцэя Пушкін піша сваю вядомую рэволюцыйную оду «Вольность». У глухую пару змрочнай рэакцыі, у Расіі прыгоннага права, аракчэеўшчыны, бізуна, калі царская Расія — жандар Еўропы — стала на чале контрраволюцыйнага Свяшчэннага саюза, восемнаццацігадовы Пушкін кідае заклік да паўстання ў імя абмежавання самаўзяржаўя моцнымі і непахіснымі законамі, у імя канстытуцыі:

Питомцы ветреной судьбы,
Тираны мира! Трепещите!
А вы, мужайтесь и внемлите,
Восстаньте, падшие рабы!

У год напісання «Вольности» ўжо існуе тайная арганізацыя дзекабрыстаў — «Союз спасения» (1816 — 1818 гг.). «Першы» і «бясспанны» прыяцель Пушкіна — І. І. Пушчын з 1817 г. становіцца членам саюза. Выдатна тое, што ўжо ў гэты час Пушкін дагадваецца аб існаванні тайнага таварыства і, не гледзячы на ўсе супярэчнасці прыяцеля, упэўнен у яго існаванні. У 1818 годзе «Союз спасения» ператвараецца ў «Союз благоденствия». У новым таварыстве будучыя дзекабрысты прымаюць новую тактыку: арганізацыя грамадскай думкі супроць манархіі Александра І і Аракчэева, стварэнне шырокай масавай і тайнай арганізацыі. Па думцы дзекабрыстаў, у «Союз благоденствия» павінны прымацца не толькі дваране, а таксама купцы, мяшчане, папы, непрыгонныя сяляне. Мэта тайнага таварыства, па паказанню Пестэля, астаецца рэволюцыйнай і на гэтым этапе. «Союз благоденствия» павінен шырока разгортваць вакол сябе сетку філіялаў — літаратурных, педагагічных, жаночых і ўсякіх іншых вольных таварыстваў, якія дзейнічаюць у яго духу.

Адным з такіх філіялаў «Союза благоденствия» было тайнае літаратурнае таварыства «Зеленая лампа», якое збіралася на кватэры друга Пушкіна — Н. Всеволжскага. Пушкін быў актыўнейшым членам гэтага філіяла «Союза благоденствия». У старой буржуазнай літаратуры «Зеленой лампе» давалася глыбока няправільная характарыстыка, якая не мае нічога агульнага з гістарычнай рэчаіснасцю. «Зеленая лампа» характарызавалася, як свецкае таварыства маладых лавеласаў, звязаных куцяжамі і агульнымі любоўнымі прыгодамі. На жаль, гэту наскрозь фальшывую характарыстыку хтоколечы прабуе адрадзіць і зараз. Супроць яе літаральна крычаць дакументы. Палітычны бок гэтага тайнага літаратурнага таварыства бясспрэчны. Захаваўся выдатны дакумент аб палітычных ідэалах «Зеленой лампы». На адным з пасяджэнняў «Зеленой лампы» член гэтага таварыства, папаўна Улыбышэў, прачытаў напісаную ім палітычную утопію пад назвай «Сон», у якой апісваў будучую паслярэволюцыйную Расію, будучы Пецербург, убачаны ім нібыта ва сне. Больш чым напаўна, што актыўны ўдзельнік «Зеленой лампы» Пушкін быў у ліку слухачоў гэтай утопіі.

Пушкін прысвяціў «Зеленой лампе» не адзін верш. Ён ярка адлюстраваў яе палітычны характар у нясканчаным «Послании к зеленой лампе».

У маі 1820 года Пушкін быў выслан на поўдзень. Ода «Вольность» і вялізная агітацыйная сіла іншых вершаў Пушкіна былі галоўнай прычынай высылкі. «Пушкіна трэба выслаць у Сібір: ён наваляў Расію абуражаючымі вершамі; уся моладзь напамяць іх чытае»,—сказаў Александр І дырэктару ліцэя Энгельгарту. Сваімі вершамі «Вольность», «Деревня», «К Чаадаеву» Пушкін агітаваў за лозунгі дзекабрыстаў — супроць прыгонніцкага права і самадзяржаўя. Пасланне «К Чаадаеву» ён заканчвае так:

Товарищ, верь: взойдет она,
Заря пленительного счастья,
Россия вспрянет ото сна,
И на обломках самовластья
Напишет наши имена!

У паўднёвай ссылцы Пушкін аблізіўся з Кішынёўскай управай «Союз благоденствия» (пазней — адзел паўднёвага таварыства), на чале якога сталі такі яркі дзекабрыст, як Міхаіл Орлоў. Рэспубліканец Охотнікаў, «першы дзекабрыст» Владзімір Раеўскі, П. С. Пушчын былі блізкімі сябрамі Пушкіна. Раеўскага Пушкін папярэдзіў аб пагражаючым яму арышце. Наведваў Пушкін і маёнтак Давыдавых — Каменку, якая была месцам канспіратыўных сходаў паўднёвых дзекабрыстаў.

1819 год і гады паўднёвай ссылкі Пушкіна багаты рэволюцыйнымі падзеямі ў заходняй Еўропе. Іспанская рэволюцыя 1820 — 1823 гг., неапалітанскія, пі'емонцкія падзеі, грэцкае паўстанне, з кіраўніком якога Інсіланці Пушкін быў асабіста знаём,—ўсё гэта пакінула глыбокі след у свядомасці Пушкіна. Ён будуе планы пабегу да Інсіланці і ўдзелу ў грэцкай рэволюцыі, аб чым піша Інсіланці пісьмо. Палітычныя погляды Пушкіна яшчэ больш адыходзяць улева. На рубяжы паўднёвай ссылкі ён абдумвае план паразабойства, а на поўдні ўсё мацней яго трывожыць думка аб рэспубліцы, сімвал якой—Брута —Пушкін апявае ў сваім вершы «Кинжал» (1821 г.). Гэты верш адразу распаўсюджваўся ў спісах у 2-й арміі і аказаўся моцным агітацыйным сродкам у руках дзекабрыстаў. Пазней на канспіратыўным сходзе Аб'яднаных славян — найбольш дэмакратычнай групы дзекабрыстаў — член паўднёвага таварыства Бестужаў-Румін чытаў пушкінскі «Кинжал», агітуючы за паразабойства, складаючы спісы паразабойцаў. Вершы Пушкіна, падпісаныя празрыстым крыптонімам «П. ш. н.», раскідваліся ў выглядзе своеасаблівых пракламацый у месцах размяшчэння палкоў.

Пытанне аб тактыцы ваеннай рэволюцыі — рэволюцыі, ствараемай толькі войскамі пад кіраўніцтвам рэволюцыйных камандзіраў, паўстае ва ўвесь рост і перад Пушкіным і перад дзекабрыстамі. Перамога іспанскай рэволюцыі ў 1820 годзе пад кіраўніцтвам ваенных кіраўнікоў Рафаэля дэль Рыэго і Антоніо Квірога яшчэ больш узмацніла дзекабрыстаў у іх думцы. Іспанская рэволюцыя прымусіла караля Фердынанда VII падпісаць у сакавіку 1820 года маніфест аб скліканні картэсаў і адмяніць канстытуцыю 1812 г. «Наша рэволюцыя будзе падобна да рэволюцыі іспанскай», — захоплена гаварыў дзекабрыст Бестужаў-Румін на сходзе Аб'яднаных славян.

Нядаўна знойдзен выдатны дакумент—дзённік кн. П. Доўгаруката, кішынёўскага знаёмага Пушкіна. У гэтым дзённіку паведамляецца, што Пушкін абвяшчаў падзіпом усякага, хто не жадаў змены ўрада ў Расіі. Самым паважаным Пушкін лічыў «клас земляробаў», а дваран лічыў неабходным вешаць. «Раней народы паўставалі адзін супроць другога, цяпер кароль ваюе з народам, прусакі — ваюе з народам, іспанскі — таксама; нягаварыў Пушкін.

Паўднёвае таварыства дзекабрыстаў аснавалася ў сакавіку 1821 года, а 9 красавіка таго-ж года Пушкін бачыўся з кіраўніком паўднёвага таварыства—Пестэлем. «Ранне правёў з Пэстэлем»,—запісаў Пушкін ў сваім дзённіку. «Разумны чалавек ва ўсім сэнсе гэтага слова... Мы з ім мелі гутарку метафізічную, палітычную, маральную і інш. Ён адзін з самых арыгінальных розумаў, якіх я знаю». Адна адрывачная французская фраза, дайшоўшая да нас, гаворыць аб тым, што гутарка ішла і аб тактыцы ваеннай рэволюцыі. Пушкін прымаў гэту

(Працяг на 3 стар.).

З. БЯДУЛЯ

Апавяданне пра Пушкіна

Старшыня калгаса «Чырвоны сцяг» Язэп Барута, частаваў мяне свежым мёдам. Я сядзеў ля кніжнай этажэркі і разглядаў яго бібліятэчку: кнігі па сельскай гаспадарцы, Ленін, Сталін, Малая Савецкая Энцыклапедыя, беларускія пісьменнікі. На адным з пачасных месц красуецца новы аднатомнік А. Пушкіна.

Я зацікавіўся.

— Дзеці вашы чытаюць?

— Я сам. Няма ў мяне дзяцей.

— Нават Пушкіна набылі?

— Пушкін — мой стары прыяцель. Гэта першая кніга, якую чытаў, як толькі навучыўся грамаце. Прызнаюся, вельмі люблю Пушкіна. Ведаю напамяць шмат з яго твораў. Кожны раз, калі яго перачытваю — усё новае ў ім знаходжу. Аднаго разу Пушкін мяне нават выратаваў ад казацкай нагайкі.

Я здзівіўся.

— Як гэта было?!

Гаспадар сеў супроць мяне на крэсле.

— Пакуль жонка напячэ бліноў — раскажу.

Язэп пачаў сваё апавяданне:

У 1903 годзе мне было каля трынаццаці год — некалькі зім я раней вучыўся ў народнай школцы, а ў трынаццаць год зрабіўся самастойным чалавекам: наняўся пасвіць кароў у блізкім фальварку. Мой старэйшы брат, Юрка, працаваў тады ў Менску на чыгунцы простым рабочым. У сёмуху ён прыехаў дамоў у госці. Гаспадар адпусціў мяне да бацькоў, каб пабачыцца з братам. Юрка прывёз мне з горада новую шапку і кнігу Пушкіна.

— На! Чытай, вучыся,—сказаў ён,— чалавекам станеш.

Хацеў гаспадар адняць у мяне Пушкіна, але мая «бібліятэка» была тады добра схавана панач: пад саламянай страхою старой пуні. Колькі гаспадар па начы ні шукаў — знаходзіць не мог. А ў дзень, на полі, як толькі заўважу, што да мяне гаспадар дыбае, схаваю Пушкіна ў траве і — няма. «Эх ты! — злаваўся гаспадар, — Пушкін ты! Пушкін!»

І пайшла ад яго на мяне мянушка — Пушкін.

На начлезе пры вогнішчы я не раз гаварыў сялянам напамяць вершы Пушкіна.

У 1905 годзе мой брат, Юрка, прыехаў з Менска дамоў у часе жніва. Ён прывёз з сабою пачку пракламацый, на якіх было напісана знізу Р. С. Д. Р. П. Юрка адразу пачаў раздаваць пракламацыі, сам чытаў сялянам і таксама загадаў мне чытаць. Памятаю якое ўражанне вузенькія, тоненькія і даўгаватыя лісткі рабілі на сялян.

І вось аднаго разу ў нядзелю адвячоркам Юрка склікаў сход. З усяе воласці прышло больш за сто чалавек. Юрка выступаў першым. Пасля яго многія з сялян гаварылі аб розных сваіх бедах і крыўдах. Брат на аснове гэтых крыўд напісаў рэзалюцыю, якая была прынята ўсім сходам з радаснымі выгукамі:

«Далоў самадзяржаўе!»

«Няхай жыве паўстанне!»

«Няхай жыве воля народная!»

Памятаю некалькі пунктаў з рэзалюцыі схода:

1. З прычыны таго, што памешчык Барануўскі няправільна захапіў адрэзкі ворнай і лугавой зямлі, за якую сяляне судзіліся дзесяць год, прапанаваць памешчыку мірна вярнуць гэту зямлю.

2. З прычыны таго, што валасны старшыня абкрадае ў пранягу 20-ці год грамадскую казну, скінуць яго з пасады і абраць свой сялянскі камітэт.

3. Не плаціць падаткаў, выкупных плацяжоў ды іншых збораў.

Пунктаў у рэзалюцыі было шмат і сяляне пачалі дзейнічаць.

І вось супроць гэтых пунктаў пан Барануўскі выклікаў казацкі атрад. Мой брат Юрка адразу ўцёк, а казакі групкамі ў 3, у 4 чалавекі гарцавалі па палях, па лугах, па вёсках і палявалі на «супастатаў». Я тады пасвіў кароў новага гаспадара. Казакі нахлынулі з вобыскам да майго бацькі. Нічога не знайшлі, але за «крамольніка» сына так пасяклі нагайкамі бацьку, што ён доўга хварэў.

У мяне астаўся з пяток братніных лісткоў. Яны ляжалі у пушкінскай кнізе, я іх шкадаваў знішчыць. Мой першы гаспадар, які даў мне мянушку «Пушкін», данёс на мяне казакам. Ён ім гаварыў, што віншаваць і Пушкін. Гэта значыць — я. У той дзень я пасвіў у полі скаціну недалёка ад густога бярэзніка і нічога не ведаў аб цёмнай хмары, што на мяне насоўваецца. Сонца лагодна грэла зямлю, спявалі птушкі, а я перачытваў пракламацыю, палажыў у кнігу і не ведаю ў каторы раз пачаў чытаць Пушкіна. Конскі тупат я пачуў толькі тады, калі тры коннікі ўжо былі зусім блізка ад мяне і затулілі ад маіх вачэй поўнеба. Я хутка падняўся і хацеў уцячы.

— Стой! — крыкнулі казакі.

Я спыніўся. Чубаты злы казак грымнуў:

— Ты Пушкін?

—Не, — адказаў я.

Адзін казак саскочыў з каня, вырваў у мяне з рук Пушкіна і давай разгортваць. Пасыпаліся пракламацыі, казак іх падхапіў. На першай старонцы кнігі ён пабачыў партрэт Пушкіна і давай па складах чытаць надрукаванае: **«А. С. ПУШ-КІН».**

— Вось яго партрэт! Глядзіце! — паклікаў «грамацей» сваіх сяброў. Яны падышлі, пачалі ўзірацца ў партрэт Пушкіна ды ў мяне.

— Зусім не падобны, — сказаў адзін з іх. Пушкін — кучаравы, куды старэйшы за пастуха. А вочы іш якія — крамольныя. (Вочы Пушкіна).

Ён з цікавасцю пачаў перагортваць кнігу, давай чытаць бэкаючы і мэкаючы:

Взглянув когда нибудь на тайный сей листок,
Исписанный когда то мною...

Загневаўся казак. Крыкнуў ад усяго сэрца.

— Вось, хто напісаў гэтыя тайныя лісткі (трасе пракламацыямі) — гэты кучаравы супастат, гэты бунтаўшчык... Сам прызнаецца!

З выглядам даследчыка казак перагарнуў яшчэ некалькі старонак.

Сижу за решеткой в темнице сырой:
Вскормленный в неволе орел молодой.

— Ведае бунтаўшчык, што яго месца ў цямніцы сырой! — растлумачыў казак.

У канцы кнігі ён наткнуўся на «пугачоўскі бунт».

— Дык вось хто супроць цара піша лісткі ды раздае сялянам! — крыкнуў ён у вялікім абурэнні і звярнуўся да мяне:— а ты памагаеш яму?

Казак замахнуўся на мяне нагайкай. Я заплакаў і давай апраўдвацца:

— Пушкін — з кудравай галавой, малады, без шапкі — толькі што прабег каля мяне, кінуў кнігу ды ўцёк.

— А ты знаеш яго?

— Знаю! Вось такі як у кнізе намаляваны.

— Куды ён уцёк?

— Вунь у той бярэзнік! — Рукой паказваю, куды уцёк Пушкін.

Казакі ўскочылі на коней, гікнулі, свіснулі ды паймчаліся ў бярэзнік шукаць Пушкіна... Я тым часам пакінуў стада і кустамі шугануў у бор. Казакі мяне не знайшлі — выратаваў Александр Сергеевіч.

Гаспадар з замілаваннем пагладзіў аднатомнік Пушкіна.

Хутка падалі на стол стог гарачых бліноў і міску смятаны.

— А старэйшы брат, Юрка, жыве? — зацікавіўся я.

— Яшчэ як? Пад Масквою, дырэктарам завода.



Увоз цела з С.-Пецербурга ў Святыя Горы. (З карціны А. Наумава). **Глухой зімняй ноччу 1837 г. жандары цара Нікалая I, таячыся і крадучыся, як злодзеі, увозілі з Пецербурга мёртвае цела Пушкіна. Царскі ўрад прабаваў ўкрасці ў рускага народу яго вялікага паэта, забітага агентам, стаўленікам дваранскай рэакцыі.**

Праф. Т. П. ЛОМЦЕЎ

Тварэц рускай літаратурнай мовы

Александр Сергеевіч Пушкін — вялікі рускі паэт, тварэц рускай літаратурнай мовы і роданачальнік новай рускай літаратуры. Пушкін абагаціў чалавецтва неўміручымі творамі мастацкай творчасці.

Да выступлення Пушкіна на літаратурную сцэну панавалі дваранскія антынародныя напрамкі ў галіне мовы. Клерыкальна-манархічны напрамак, які ўзначальваў Шышкоў, перш за ўсё патрабаваў арыентацыі ў развіцці рускай мовы на славянскую, распаўсюджванне кніг царкоўных, патрабаваў ад чытачоў пераймання мовы біблійскіх царкоўных кніг.

Шышкоў выганяе ўсё замежнае, выганяе ўсе французскія элементы. Змагаючыся супроць упливу замежных моў на рускую, ён прапаведваў рэакцыйна-утапічную ідэю аб захаванні славянскай мовы, як асновы рускай літаратурнай мовы, прапаведваў зварот да славянскай мовы.

Рэакцыйнасць гэтага вучэння асабліва ярка кідаецца ў вочы, калі мы ўспомнім, што праз дзесяць год Пушкін, дзекабрыст Рылееў і іншыя, стоячы на рэвалюцыйна-дэмакратычных прагрэсіўных пазіцыях, даказвалі, што коранем і асновай рускай літаратурнай мовы з'яўляецца мова народная. Яны, Пушкін, Рылееў і інш., прапаведвалі любоў да народу і да яго мовы. Пушкін звязваў любоў да народу і яго мовы з рэвалюцыйнасцю дзекабрызма.

Апэльваючы гэту, узначальваемую Шышковым, плынь, мы павінны сказаць, што яна ў корані з'яўляецца рэакцыйнай, яна адлюстроўвала барацьбу феадальна-памешчыцкіх элементаў за захаванне прыгонніцтва, цэмры і невуцтва шырокіх народных мас, за атручванне народных мас оріумам рэакцыйнага нацыяналізма і рэлігійных перакананняў. Яна арыентавала развіццё рускай мовы таго часу на цёмнае сярэдневякоўе, змагаючыся супроць далучэння рускай мовы да той культуры мовы, якая была на Захадзе, змагаючыся супроць збліжэння літаратурнай мовы з мовай народных мас.

Прадстаўнікі другога напрамку, салонна-прыдворнага, зразумелі, што арыентаваць рускую мову на царкоўна-славянскую мову нельга, што апошняя не можа служыць крыніцай для развіцця рускай мовы ў новым напрамку, які павінен паставіць яе ў рад еўрапейскіх моў. Яны таму разгарнулі энергічную барацьбу супроць славянскай мовы, зусім ігнаруючы той факт, што гэта мова была літаратурнай мовай рад стагоддзяў, што калі яна да таго часу і ажыла, то яна пакінула ў рускай мове запас такіх слоў, без якіх зусім немагчыма абыйсціся.

Зусім відавочна, што прадстаўнікі разглядаемага напрамку былі правы, калі змагаліся супроць абвяшчання славянскай мовы коранем рускай літаратурнай, але яны былі зусім не правы, калі абвяшчалі вайну супроць усякіх слоў, пранікшых у рускую мову з славянскай мовы.

Змагаючыся супроць арыентацыі рускай мовы на славянскую мову, яны высоўвалі ў якасці ідэала, па якому павінна раўняцца руская літаратурная мова, гаворку прадстаўнікоў царскага двара, буйных салонных дам і разважлівых міністраў.

Прадстаўнікі гэтага салонна-прыдворнага магнацтва трэтыравалі ўсё рускае, народнае і ацэньвалі дастоінства рускай мовы па-французскаму.

Найбольш ярка гэту арыстакратычна-прыдворную, антынародную ўстаноўку выразіў прыдворны паэт Дзмітрыеў у «Вестніке Европы». Вось што пісаў Дзмітрыеў:

«Якое-ж задавальненне знойдзе добра выхаваная дзяўчына, слухаючы сварку аднадворца з жонкай, лаянку дурня з дурніцай, якіх кожнае слова нязносна для далікатнага слыху?.. Якая наогул патрэба знатнейшай часткі публікі: баярыні, баярыну, першастацейнаму адкупшчыку або заводчыку,—якая карысць ім ведаць, што адбываецца ў карчмах, на сельскіх кірмашах і ў хаціне аднадворцаў, якія вядомы толькі іх старастам і ўправіцелям? У іх свае звычаі, свае забабоны і свае заганы...»

І так руская літаратурная мова павінна раўняцца не на мову рускага народу, а на мову разважлівых і благародных міністраў, будуарных дам і вялікасвецкага грамадства; наогул, у літаратурнай мове трэба пазбягаць усяго таго, што напамінае сапраўдную мову народных мас.

Новыя социяльна-эканамічныя адносіны патрабавалі высоўвання роднай мовы мас і замацавання яе ў літаратуры.

Першы, хто ўсвядоміў гэту задачу і хто высунуў рускую мову ў літаратуру, быў вялікі геній рускага народу, выхадзец з народу — Міхаіл Васільевіч Ламаносаў. Але Ламаносаў у сілу адпаведных умоў часу не мог быць творцом рускай літаратурнай мовы. Значныя послугі ў апрацоўцы рускай мовы мы павінны адзначыць у Карамзіна, але, вядома, і Карамзін не быў творцом рускай літаратурнай мовы і не таму, што да таго часу не наспелі грамадска-эканамічныя ўмовы, а таму, што ён стаяў на пункце погляду неабходнасці культывавання салонна-прыдворнага стылю.

Толькі Пушкін быў сапраўды творцом сучаснай рускай літаратурнай мовы, як мовы іменна рускага народу, а не мовы салонна-прыдворных, клерыкальна-памешчыцкіх колаў.

Па гэтаму пытанню мы мелі неаднаразовыя ўказанні партыі і ўрада. Ленін у першыя гады пасля Кастрычніцкай рэволюцыі, калі наша краіна яшчэ знаходзілася ў стане разрухі, пісаў работнікам Наркомасветы аб неабходнасці стварэння слоўніка рускай мовы, у які павінны былі, па думцы Леніна, увайсці словы з літаратуры ад Пушкіна да Горкага. Ленін гаварыў, што гэты слоўнік павінен ахапіць лексічны запас новай рускай літаратуры, пачатак якой ён звязваў з імем Пушкіна. Нарэшце «Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР ад 16 снежня 1935 года аб аснаванні Ўсесаюзнага Пушкінскага Камітэта» прама ўказвае, што Александр Сергеевіч Пушкін — тварэц рускай літаратурнай мовы і роданачальнік новай рускай літаратуры.

Пушкін адзначаў, што рускай літаратурнай мовы, якая-б адказвала сучасным задачам, яшчэ не было. Ён адзначаў далей, што такая мова можа быць створана толькі на аснове народнай мовы. Вылучэнне народнай мовы ў якасці асновы літаратурнай мовы ў Пушкіна звязвалася з любоўю да свайго народу, яго мовы і з рэволюцыйнасцю дзекабрызма.

Пушкін пісаў, што толькі рэволюцыйная галава Пестэля, тагочаснага прадстаўніка рэволюцыйнай Расіі, дзекабрыста, магла па-сапраўднаму любіць народ, а разам з тым і яго мову. Такім чынам, вылучэнне роднай, народнай мовы ў якасці асновы літаратурнай мовы ёсць справа рэволюцыйнага парадку, якая ідзе па лініі дзекабрызма. Дзекабрысты былі тымі прадстаўнікамі тагочаснай Расіі, якія разам з Пушкіным змагаліся за права народнай мовы, за замацаванне яе ў літаратуры. У гэтых адносінах дастаткова ўказаць на Рылеева. Свае творы Пушкін у сталым узросце, па словах Горкага, пісаў чыстай рускай народнай мовай. Стаючы на пазіцыях народнай рускай мовы, Пушкін змагаўся супроць прадстаўнікоў салонна-прыдворнага стылю.

Пушкін бічуе ў сваіх шматлікіх выказваннях культ мовы свецкай, будуарнай дамы; адстойваючы права народнай мовы на літаратурнае афармленне, ён пратэстуе супроць кваліфікацыі слоў з народнай мовы то бурлацкімі, то мужыцкімі. Пушкін заяўляе, што разгаворная мова простага народу дастойна глыбокага доследу і ўсямернага паважання.

Пушкін змагаўся таксама супроць установак прадстаўнікоў клерыкальна-манархічных, феадальна-памешчыцкіх кругоў на чале з адміралам Шышковым. Пушкін прама супярэчыў супроць шышкоўшчыны, супроць імкнення Шышкова павярнуць гісторыю назад. Пушкін неадночы высмейваў рэакцыйна-феадальныя ўстаноўкі Шышкова.

Пушкін апраўдвае гістарычны ўплыў французскай мовы на рускую. Ён неаднойчы падкрэслівае гэта ў тым-жа рамане «Евгений Онегин». Вось некалькі радкоў з першага раздзелу:

«Но панталоны, фрак, жилет —
Всех этих слов на русском нет».

Пушкін, змагаючыся за стварэнне рускай літаратурнай мовы на аснове народнай, не зводзіў сваю задачу да насычэння літаратурнага слоўніка «простанароднымі» словамі, ён разумеў сваю задачу шырэй, у гісторыка-культурным плане. Гэты бок пушкінскіх поглядаў на мову вельмі добра ацаніў рускі крытык Белінскі. Белінскі пісаў: «хто ўмее схватваць рэзкія адценні толькі грубага простанароднага жыцця, не ўмеючы схватваць больш тонкіх і складаных адценняў адукаванага жыцця, той ніколі не будзе вялікім паэтам; і яшчэ менш мае права на гучны тытул нацыянальнага. Вялікі нацыянальны паэт умее прымусіць гаварыць і пана і мужыка на іх мове». Першым нацыянальна-мастацкім творам, — гаворыць Белінскі, — быў «Евгений Онегин» Пушкіна, напісаны чыстай народнай рускай мовай.

Значэнне Пушкіна заключаецца ў тым, што ён стварыў літаратурную, значыць, мову, якая ўвабрала ў сябе ўсе папярэднія гістарычныя дасягненні. Але ўвесь папярэдні гістарычны моўны вопыт Пушкін апрацаваў на аснове народнай рускай мовы; у рэзультаце атрымалася руская літаратурная мова, як мова рускага народу. Пушкін не прыніжаў літаратурнай мовы да простанароднасці, наадварот, ён узвышаў народную мову да ступені літаратурнай мовы. Народнасць мовы не зводзілася ў Пушкіна да простанароднасці, як у Даля.

Для характарыстыкі народнасці мовы Пушкіна мы прывядзём некалькі прыкладаў падобнага роду з розных твораў Пушкіна. Яшчэ ў першым, можна сказаць, хлапчуковым творы, у «Бове» Пушкін ужывае такія словы і выразы, якія сучаснікам здаваліся простанароднымі. Вось яны: «девица красная», «очи ясные», «очи зоркие», «буйны головы», «тихохонько», «низехонько», «заспасибо» і інш. Знаходзім мы падобнага роду словы і выразы і ў другім юнацкім творы «Руслан і Людміла».

Прывядзём яшчэ некалькі прыкладаў падобнага роду з «Бориса Годунова». Пушкін тут выводзіць народныя масы і, як гравільна заўважае Белінскі, «умее прымусіць гаварыць і пана і мужыка іх мовай». Мы сустракаемся тут з характэрнымі элементамі: «нет ли лубу», «потрем глаза, я слоной помажу», «вот и бука», «куды», «вольному воля», «что тебе Литва так слюбилась» і таму падобныя выразы, якія перасыпаюць гутарку асобных герояў «Бориса Годунова».

Але народная мова была толькі асновай. Пушкін скарыстаў на гэтай аснове ўсе папярэднія дасягненні культуры ў галіне мовы.

Пушкін змог адабраць такія славянізмы, якія цяпер увайшлі ў нацыянальны скарб і здкінуць устарэлае і шкоднае. Дастаткова ўзяць хоць-бы твор «Вольность», каб упэўніцца ў гэтым. У гэтым вершы мы маем рад славянізмаў. Напрыклад: **«благородный след», «восстаньте, падшие рабы», «владыки», «се** — злодзейская **порфира», «самовластительный** злодей» і шмат іншых.

Таксама абстаіць з заходне-еўрапейскімі элементамі. Пушкін чэрпаў з заходне-еўрапейскіх моў пераважна французскай асобныя словы і выразы, выходзячы з задачы стварэння сваёй рускай літаратурнай мовы.

Так вырашыў Пушкін праблему стварэння рускай літаратурнай мовы. Якое значэнне мае творчасць Пушкіна ў галіне мовы для нашай сучаснасці? Мы павінны вывучаць спадчыну Пушкіна ў галіне мовы і авалодваць ёю. Мы павінны вучыцца ў Пушкіна любві да мовы народу, мы павінны вучыцца ў Пушкіна майстэрству ўладання рускай мовай. Спадчына Пушкіна ў галіне мовы цесна звязана з апошнімі дыскусіямі па пытанню аб тым, якой павінна быць руская літаратурная мова нашага часу.

Ахоўнікам і прадаўжальнікам вялікіх традыцый у апрацоўцы і культуры рускай мовы з'яўляецца Максім Горкі, вялікі пролетарскі пісьменнік. Горкі ў сваім пісьме аб чыстаце рускай мовы чотка паставіў пытанне аб тым, якой павінна быць наша руская літаратурная мова.

З пункту гледжання ўказанняў Горкага спадчына Пушкіна ў галіне мовы набывае асаблівае значэнне.

«Ці можа быць няўдзячны народ-пераможца, — пісала «Правда», — свайму галіканму песняру, геніяльнаму паэту, які ў чароўных вершах апяяў краіну, жывымі фарбамі паказаў народныя характары, абудзіў сімпатыі да правадыроў сялянскіх паўстанняў, адкрыў багацце рускай мовы? Не, любоў да сваёй радзімы, любоў да слаўнага мінулага свайго народу непарыўна звязана з любоўю да рускай літаратуры, з любоўю да Пушкіна» («Правда», 5 студзеня 1937 г.).

Толькі наша социялістычная эпоха зрабіла даступнымі прыгожасці мовы геніяльных твораў паэта Пушкіна, толькі ў нашай краіне, якая ідзе ад перамогі да перамогі пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна, пушкінская спадчына ў галіне мовы стала даступнай мільёнам працоўных мас.

А. С. ПУШКІН
НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Да вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі беларускую мову трымалі ў загоне паны, памешчыкі і капіталісты, яны не давалі ніякай магчымасці ёй існаваць, называлі яе «хамскай».

Пра беларускую мову ў пісьме беларускага народу да вялікага Сталіна гаворыцца:

Мы расцілі яе клапатліва, надзейна,
За яе правялі мы з нацдэмамі бой.
І даступнымі сталі нам Пушкін і Гейне,
Руставелі і Горкі, Бальзак і Талстой.

Зараз на беларускай мове вялікімі тыражамі друкуюцца творы геніяльных правадыроў чалавецтва Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна, творы вялікіх паэтаў і пісьменнікаў. Выдатныя творы лепшага сына рускага народу Александра Сергеевіча Пушкіна ў 1937 годзе выйдуць у тысячных тыражах. Беларускі народ будзе чытаць Пушкіна на сваёй роднай мове. Гэты факт гаворыць аб інтэрнацыянальным яднанні народаў нашай вялікай радзімы, аб дружбе ўсіх народаў, якая выпеставана вялікім Сталіным, аб перамозе ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

Стагоддзе з дня смерці геніяльнага паэта Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі адзначае выданнем такіх твораў А. С. Пушкіна, як «Цыганы», «Каўказскі нявольнік», «Домік у Каломне», зборнікамі «Казкі», «Выбраная проза», «Выбраныя творы» і інш. Зараз ідзе інтэнсіўная падрыхтоўка да друку многіх твораў паэта ў перакладзе на беларускую мову лепшымі паэтамі і пісьменнікамі Беларусі. Так, выйдуць асобнымі выданнямі «Паэмы», «Драматычныя творы», «Капітанская дачка», «Цалтава», «Медны коннік», «Дуброўскі», «Еўгеній Онегін», «Руслан і Людміла» і інш. Работа над перакладамі твораў Александра Сергеевіча на беларускую мову народных паэтаў БССР Янкі Купалы і Якуба Коласа, Андрэя Александровіча, Кузьмы Чорнага і інш. — паказальнік далейшага росту беларускай літаратуры — факт вялікай палітычнай значымасці. Прыемна і радасна чытаць пераклады Купалы, Коласа, Александровіча, якія захоўваюць музычную сілу пушкінскага верша, пераклады Кузьмы Чорнага і інш., якія захоўваюць чароўную пекнату пушкінскага стылю ў прозе.

Да канца 1937 года ў Дзяржаўным выдавецтве Беларусі павінны выйсці ўсе творы А. С. Пушкіна на беларускай мове. Пасля выдання ў масавых тыражах асобных твораў у бягучым годзе будзе выдан таксама поўны збор твораў паэта ў двух вялікіх кніжках. Усё гэта будзе дастойным помнікам геніяльнаму паэту народа, любімцу свабоды і шчасця ад вызваленага і квітнеючага беларускага народу, які пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна выйшаў на прасторы жыцця.

П. КАВАЛЁЎ.



Аўтограф Пушкіна «Пісьмо Тацьяны к Онегіну».

ПАРТРЭТ З ЗАПАЛАК

Электраманцёр рэчыцкай запалкавай фабрыкі «Х Кастрычнік» мастак-самавучка Пётр Фёдаравіч Каўшэўны скончыў работу над партрэтам вялікага рускага паэта А. С. Пушкіна. Партрэт складзен з 50 тыс. рознакаляровых запалак.

Мастак-самавучка т. Каўшэўны пачаў маляваць з 10 год. Маляваў пейзажы, нацюрморты, копіі з карцін. На рэчыцкай запалкавай фабрыцы «Х Кастрычнік» ён працуе ўжо 8 год. Упершыню пачаў рабіць партрэты з запалак у 1934 годзе. Гэта вельмі цяжкая і карпатлівая работа. На кожны партрэт расходуецца да 85 тыс. запалак розных колераў. Апрача таго трэба было вырашыць—на чым замацаваць такую колькасць запалак, каб яны не рассыпаліся. І аказалася, што лепш усяго — на жалезнай сетачцы ў раме.

З захапленнем працаваў т. Каўшэўны. За два гады ён зрабіў 8 партрэтаў таварыша Сталіна, два т. Молатава, адзін т. Лобава, два партрэты Леніна, адзін свайго бацькі. Зроблены асобны партрэт «Ленін і Сталін у Горках» складзен са 170 тыс. запалак. Работы самавучкі былі прадстаўлены на выстаўцы XI Усебеларускага З'езда Саветаў, на ўсесаюзнай нарадзе стаханаўцаў фанерна-запалкавай прамысловасці і інш. Партрэты захапляюць сваёй арыгінальнасцю і мазаічнасцю.

Зараз у яго кватэры стаіць няскончаны партрэт з запалак «Ленін на трыбуне». У плане работы мастака-самавучкі — зрабіць партрэты 5 маршалаў Совецкага Саюза. Аднак, у апошні час т. Каўшэўны зусім амаль перастаў працаваць і ўдасканальвацца. Справа ў тым, што яму не дапамагаюць. Дапамога патрэбна матэрыяльная і маральная. За карпатлівую і складаную працу яму па праву належыць увага, якой няма.

Мы спадзяемся, што Камітэт па справах мастацтваў зацікавіцца жыццём і работай мастака-самавучкі. **Н. ГАСМАН.**

ЯК БЫЎ ВЫРАТАВАН І АДНОЎЛЕН ДОМІК НЯНІ

Разбурэнне дваранскіх маёнткаў у гады рэволюцыі і грамадзянскай вайны не прамінула і сяла Міхайлаўскага, у якім часта жыў А. С. Пушкін. З будынкаў, якія былі пры жыцці паэта, астаўся адзін домік няні, выратаваны ад разбурэння і адноўлены па ініцыятыве былога начальніка штаба асобай Башкірскай стралковай брыгады Чырвонай Арміі тав. Загіда Хаджаевіча Гарэєва.

Па просьбе рэдакцыі «Звязды» палкоўнік Гарэєў напісаў успаміны, якія змяшчаюцца ніжэй. Апісаны ім эпізод ярка паказвае, з якой бярэжлівасцю і клопатам адносіліся нават у трывожныя дні баёў байцы і камандзіры маладой Чырвонай Арміі да капітоўных культурных помнікаў, як глыбока шанавалі імя вялікага рускага паэта.

Асобная Башкірская стралковая брыгада вясной 1920 года накіроўваецца на граніцу з Латвіяй. Месцам стаянкі штаба былі ўстаноўлены Святыя горы, пад штаб адведзен дом настаяцеля Светагорскага манастыра.

Абыходзячы манастырскую тэрыторыю для адной царквы на невялікай плошчы, абгароджанай рашоткай, мы нечакана ўбачылі магілу Пушкіна. За ёй ніхто не даглядаў, і яна мела самы запушчаны выгляд: наакол—смецце і бруд, надмагільны помнік увесь спісаны і запэцканы, крыж з помніка ўкрадзен манахамі, якія думалі, што ён зроблен з золата. Дарожка да магілы была таксама запушчана.

Мы хутка сіламі камандзіраў і байцоў упарадкавалі магілу: убралі смецце і бур'ян, падмялі пляцоўку, вычысцілі помнік. У далейшым устанавілі догляд за магілай. За час нашай стаянкі магіла паэта карысталася пастаяннымі клопатамі байцоў і камандзіраў. Шмат байцоў з нашай часці і суседніх часцей пабывалі на магіле вялікага паэта.

Аглядаючы магілу, я ўспомніў сваё мінулае, свае вучнёўскія гады, калі з захапленнем вывучаў творы Пушкіна. Я ведаў з біяграфіі паэта, што недалёка ад Святых гор знаходзіцца родная Пушкіна сяло Міхайлаўскае. Пры першай-жа магчымасці я з групай камандзіраў паехаў туды.

Такая-ж непрыглядная карціна чакала нас і ў Міхайлаўскім. Усюды ляжалі сляды разбурэння. Дом Пушкіна быў спалены і яго месца азначалі толькі гнёзды фундамента, запоўненыя вугалём і пылам. Адзіны будынак — домік няні, звязаны з імем Пушкіна, дажываў апошнія дні. Ён уяўляў з сябе поўразбураны зруб без падлогі і столі. Печ была напалову разабрана, вокны і дзверы зняты.

Мы сабралі сялян — жыхароў Міхайлаўскага. Я растлумачыў ім, што гэта за домік і неабходнасць яго захавання. Гэта маё патрабаванне было выканана, і пры сваіх далейшых наведваннях Міхайлаўскага прымет новага разбурэння я ўжо не заўважаў.

У мяне ўзнікла думка аднавіць домік няні. Але для гэтага патрэбна было ведаць, што ўяўляў домік да разбурэння. Сярод нас ведаючага чалавека не было. Мы апытвалі мясцовых старажылаў, але і гэта нам не давала поўнага малюнка.

Выпадак вырашыў гэта пытанне. Аднойчы да нас з'явіўся пажылы чалавек, які назваў сябе пушкіністам Усціновічам. Ён пабываў у Міхайлаўскім і Трыгорскім і даведаўся там аб прымаемых намі мерах па захаванню помнікаў, звязаных з імем Пушкіна. Мы доўга гутарылі. Я выказаў гатоўнасць да аднаўлення доміка няні.

— Уся астаноўка толькі з-за апісання, — сказаў я.

Усціновіч вельмі абрадаваўся. Ён паціснуў мне руку і адразу выклаў на стол з свайго чамадана цэлую кучу фотакартак і рысункаў з доміка няні. Я папрасіў тав. Усціновіча ўзяць на сябе кіраўніцтва аднаўленнем доміка. Ён з вялікай ахвотай згадзіўся. Мы на другі-ж дзень накіравалі ў Міхайлаўскае сапёрную роту. Сапёры, ведаючы якую яны работу выконваюць, вельмі дружна і энергічна ўзяліся за справу. За тыдзень домік няні быў адноўлен. Сваімі асабістымі ўказаннямі і парадамі тав. Усціновіч кіраваў работай. Вялікую дапамогу па аднаўленню доміка аказалі мой памочнік т. Колюбакін і камандзір сапёрнай роты т. Турчаніноў.

Па маёй просьбе начальнік палітаддзела брыгады т. Тэрнер узняў перад апочкінскім павятовым выканкомам пытанне аб далейшай апецы доміка. Быў наняты спецыяльны вартаўнік.

І пасля гэтага мы не забывалі любімае Міхайлаўскае Пушкіна, часта яго наведвалі, не аднойчы пабывалі і ў Трыгорскім, якое так любіў наведваць паэт. Сярод байцоў часці, не гледзячы на тое, што часць была нацыянальнай, творы Пушкіна сталі яшчэ больш папулярнымі і любімымі.

Так у першыя гады рэволюцыі, у цяжкія часы яшчэ няскончаных баёў, мы аддалі сваю скромную даніну вялікай памяці А. С. Пушкіна.

Палкоўнік ЗАГІД Х. ГАРЭЕЎ.

«ПУШКІН З НЯНІ». Эпюда, выкананае барысаўскай ганчарнай арцеллю па эскізу мастака А. І. Жорава. Фото Лупейка (БСФ).

А. С. ПУШКІН

ЭПІГРАМЫ

НА АЛЕКСАНДРА І [1])

Узрошчаны пад барабанам,
Стаў цар наш дзіва-капітанам:
Пад Аўстэрліцам ён бяжыць,
Пасля ў дванаццатым дрыжыць;
Затое — фрунтавы прафесар.
Ды фрунт герою прыкрым стаў.
Цяпер калескі ён асэсар
У галіне замежных спраў.

[1]) Александр І — рускі імператар з 1801 па 1825 год, апякун і вораг Пушкіна. Па яго загаду Пушкін быў сасланы.

НА АРАКЧЭЕВА [2])

Ён — Расіі прыгнятальнік,
Палначаленых катавальнік
І Савета навучальнік,
А цару — ён друг і брат.
Без мазгоў, пачуццяў, чэсці,
Усіх жыўцом гатовы з'есці,
Ён — «адданы ўвесь без лесці»
. . . . грошавай салдат.

[2]) Аракчэеў А. А., граф, начаснік пры Паўле І і Александры І, з чым імем звязана цэлая эпоха палітэйскага дэспатызма і грубай ваеншчыны («аракчэеўшчына»).

НА ВАРАНЦОВА [3])

Поўневука і поўгероя,
Поўпадляца — ды не канец:
Надзея ёсць яшчэ на тое,
Што будзе поўны ён падлец.

[3]) Граф М. С. Варанцоў — Новарасійскі губернатар, пасля намеснік на Каўказе. Высланы з Пецербурга Пушкін знаходзіўся ў яго на службе ў Одэсе.

НА ФОЦІЯ [4])

Поўшэльма, поўфанатык ён.
Яго духоўныя прылады:
Крыж, мяч, бізун, яшчэ праклён.
У бога просім мы спагады:
Пазбаў ад пастыраў такіх,
Поўбізкаватых, поўсвятых.

[4]) Архімандрыт Фоцій — заўзяты рэакцыянер і інтрыган, адзін з прыближаных супрацоўнікаў Александра І.

НА БУЛГАРЫНА [5])

Не ў тым бяда, Аўдзей Флогарын,
Што родам ты не рускі пан,
Што на Парнасе ты цыган,
Што ў свеце ты—Відок [6]) Фіглярын:
Бяда, што нудны твой раман.

[5]) Ф. В. Булгарын — рэакцыйны пісьменнік і журналіст, агент жандармерыі. Імя Булгарына — сімвал палітычнай прадажнасці.

[6]) Відок — французскі сышчык. Напісаў у свой час «Мемуары», перакладзеныя на рускую мову. Імя яго стала мянушкай.

НА КАРАМЗІНА [7])

Яго «Гісторыя» даводзіць нам спаўна
У форме зграбнай, простай, яснай
для грамадства
І неабходнасць самаўладства,
І асалоду бізуна.

[7]) Н. М. Карамзін (1766—1826) — пісьменнік і літаратурны дзеяч. З 1804 года, атрымаўшы званне гісторыяграфа, перастае займацца літаратурай і піша «Гісторыю дзяржавы расійскай». Тэндэнцыйна-манархічнае асвятленне рускага гістарычнага працэса абазлілае Карамзіна з царом, які пасяліў яго каля сябе ў Царскім Сяле.

Пераклаў К. КРАПІВА.

ЛЁС РУКАПІСНАЙ СПАДЧЫНЫ А. С. ПУШКІНА

У дзяржаўных музеях і архівах СССР беражліва, як найвялікшы скарб, захоўваюцца арыгінальныя рукапісы, якія належаць перу генія рускага народу — Александра Сергеевіча Пушкіна.

Сабраць рукапісную спадчыну найвялікшага рускага паэта было нелёгкай пяжка. Аднак, велізарныя намаганні, накіраваныя на росшук пушкінскіх аўтографаў, далі свае рэзультаты: пераважная большасць рукапісаў паэта сабрана і сканцэнтравана зараз у совецкіх архівахавальніках.

Цікавасць да аўтографаў Пушкіна была надзвычай вялікая і пры жыцці паэта. Першымі збіральнікамі гэтых аўтографаў былі ліцэйскія таварышы паэта (у прыватнасці, А. М. Гарчакоў і Н. Л. Якаўлеў). Колькасць уласнікаў асобных пушкінскіх рукапісаў ужо ў той час правышала 100 чалавек.

Асноўныя матэрыялы—усе чарнавікі, рабочыя спыткі і т. д.—паэт захоўваў у сваім асабістым архіве. Лёс гэтай асноўнай скарбніцы пушкінскай рукапіснай спадчыны — яго асабістага архіва (які знаходзіўся ў габінеце паэта ў момант яго смерці)—прадстаўляе вялікую цікавасць.

Праз 3/4 гадзіны пасля смерці паэта, як пісаў Жукоўскі ў пісьме бацьку паэта С. Л. Пушкіну, пасля таго, як цела гынеслі ў бліжэйшы пакой, ён (Жукоўскі) па загаду цара «запячатаў габінет сваёй пячаткай». І толькі 20 лютага 1837 года, ужо пасля тайнага пахавання паэта, габінет нябожчыка быў ускрыт, і «усе належаўшыя паэту паперы, пісьмы і кнігі ў рукапісах сабраны, уложаны ў дзве скрыні і запячатанымі перавезены на кватэру дзействіцельнага стацкага савэтніка Жукоўскага, дзе і пастаўлены ў асобным пакоі» (з журнала, які вёўся пры разборах папер нябожчыка А. С. Пушкіна).

Начальнік штаба корпуса жандараў Дубельт на працягу 16 дзён з дапамогай жандарскіх пісараў рабіў разбор і сартыроўку рукапісаў Пушкіна, а затым і іх старанны паліцэйскі «агляд». Гэта быў сапраўдны пасмертны вобыск, зроблены ў Пушкіна па загаду Нікалая І. У часе гэтага вобыску Дубельт перш за ўсё звярнуўся да пісем П. А. Вяземскага (які быў у жандароў, на падазрэнні), паэта Дэльвіга, а таксама да пісем дзекабрыстаў Рылеева і Кюхельбекера.

Перарыў рукамі царскіх жандараў асабісты архіў Пушкіна змяшчаў самае выдатнае, што дайшло да нас з усёй рукапіснай пушкінскай спадчыны — рабочыя спыткі паэта. Такіх чарнавых спыткаў у архіве паэта было 16. Гэтыя пушкінскія спыткі, у якіх урыўкі мастайкай прозы, чарнавікі пісем, заметак і крылычных артыкулаў перамяжаюцца з бяссмертнымі строфамі «Евгения Онегина», накідамі цэлых вершаў, спыткі, размаляваныя пушкінскімі рысункамі, дазваляюць нам праз 100 год пасля смерці паэта, выразна ўявіць сабе жывога Пушкіна. У гэтым іх велізарная, вечная каштоўнасць.

Першы з гэтых чарнавых спыткаў адносіцца да 1817 года — да ліцэйскага перыяду. У гэтым спытку Пушкін пачаў «Руслана и Людмилу». Другі спытак змяшчае чарнавік «Кавказского пленника». У трох наступных спытках змяшчаецца тэкст «Кавказского пленника», план «Гавриилиады», «Братьев разбойников», а таксама план задуманай Пушкіным паэмы на тэму з старажытнай рускай гісторыі.

Вялікую цікавасць прадстаўляе спыткі, у якім паэт 20 мая 1823 года пачаў пісаць «Евгения Онегина», а таксама спытак, які змяшчае чарнавыя накіды «Бориса Годунова» (поўны чарнавы рукапіс якога не захаваўся). Адзін з спыткаў, пачаты ў часе прабывання паэта ў Міхайлаўскім, змяшчае канец «Цыган», строфы VI і VII главы «Евгения Онегина», а таксама казкі, запісаныя са слоў Арыны Радзіёнаўны, няні Пушкіна.

У адным з рабочых спыткаў захаваліся цікавыя вопыты пушкінскіх перакладаў з іспанскай на французскую мову, а таксама перапісаная Пушкіным яўрэйская азбука.

У ліку рабочых спыткаў у архіве былі: два так званыя «арзрумскія» спыткі, альбом з запісам «Медного всадника», «Сказки о царе Салтане», «Анджело» і інш. твораў, асобны спытак з запісам казацкіх песень і дарожных уражанняў у часе паездкі ў Орэнбург, спытак з чарнавіком «Полтавы» і інш.

У сваім апошнім чарнавым спытку, пачатым у 1833 годзе, Пушкін напісаў чарнавікі артыкула «Путешествие из Москвы в Петербург», «Сцены из рыцарских времен», а на апошняй старонцы—верш «Я памятник себе воздвиг нерукотворный...»

Большая частка астатніх разрозненых рукапісаў пушкінскага асабістага архіва была спыта жандарамі ў 15 спыткаў. У іх былі запісы «Повестей Белкина», «Дубровского», «Путешествия в Арзрум», «Домика в Коломне», «Русалки», «Каменного гостя», «Скупого рыцаря» і іншых твораў паэта. Нескытымі асталося звыш 500 асобных лістоў пушкінскіх рукапісаў.

Зараз, пасля 124 год з таго часу, калі быў напісан першы з дайшоўшых да нас аўтографаў вялікага паэта, пераважная большасць яго рукапісаў, прайшоўшых праз рукі больш 500 уласнікаў, сабрана ў музеях і з'яўляецца ўласнасцю совецкай дзяржавы. За межамі краіны совецкіх няма значная колькасць аўтографаў Пушкіна ёсць у Парыжы. Празе і іншых гарадах Еўропы.

Частка арыгінальных рукапісаў з пушкінскіх фондаў нашых музеяў будзе экспанавана на ўсесаюзнай пушкінскай выстаўцы, якая адкрываецца ў дзяржаўным гістарычным музеі 18 лютага. (БЕЛТА).

У БІБЛІЯТЭЦЫ МТС

Вечарам у бібліятэцы першай Менскай машынатрактарнай станцыі поўна чытачоў. Па дарозе з майстэрні заходзяць у бібліятэку трактарысты і трактарысткі, камбайнеры, слесары, механікі.

— Дайце паэму Пушкіна, — просіць камбайнер Владыка.

— І мне таксама што-небудзь з лірыкі Александра Сергеевіча, — зварачаецца трактарыстка Вера Гладкая.

Маладая бібліятэкарша Дубанос выбірае творы А. С. Пушкіна. За адзін вечар яна выдае на рукі дзесяткі экземпляраў кніг вялікага рускага паэта.

— Нікога нашы трактарысты так не любяць, як Пушкіна. — кажа Дубанос. — Кожны хоча чытаць Пушкіна. Узяць, напрыклад, нашага каваля Малчанава. Ён прачытаў ужо «Капитанскую дочку», «Евгений Онегин», «Избранная лирика» Многія трактарысты напамяць вывучаюць вершы Пушкіна.

А такіх чытачоў у МТС многа. У чытальні бяруць кнігі 363 чал. Кожны трактарыст, камбайнер, механік прачытаў не менш двух буйнейшых твораў Александра Сергеевіча Пушкіна.

— Толькі малавата ў бібліятэцы кніг Пушкіна, — скарэліцца бібліятэкарша. — Трактарысты просяць кніг аб жыцці і творчасці паэта, а іх няма бібліятэка зусім не мае.

А. ЛЯСНЫ.

ЛІТАРАТУРНЫ ВЕЧАР У КАЛГАСЕ

З выключнай цеплынёй ушаноўваюць памяць вялікага рускага паэта калгаснікі Менскага раёна. У калгасе імя Варашылава і соўгасе «Горкі-Апчак», Апчацкага сельсовета, праведзены літаратурныя пушкінскія вечары. На гэтых вечарах калгаснікі заслухалі даклады аб жыцці і творчай дзейнасці паэта. Апрача гэтага на вечары ў калгасе імя Варашылава былі прачытаны і разабраны такія творы Пушкіна, як «Деревня», «К Чаадаеву», «Послание в Сибирь» і інш.

Сіламі калгаснага драмгуртка была паказана інсцэніроўка па твору Пушкіна «Сказка о попе и работнике его Балде».

У гэты вечар калгаснікам і калгаснікам выязная бібліятэка імя Леніна выдала для чыткі 20 твораў мастацкай і палітычнай літаратуры.

Калгаснікі і рабочыя соўгаса былі задаволены сваім вечарам і шмат чаго даведаліся аб жыцці і рабоце А. С. Пушкіна.

А. СОНІН.

ДЗЕЦІ З ЛЮБОЎЮ ВЫВУЧАЮЦЬ ПУШКІНА

10 беларускіх, рускіх і яўрэйскіх гурткоў аб'яднае літаратурная секцыя менскага Палаца піонераў і акцябрат. імя Н. Ф. Гікало. Больш 200 дзяцей наведвае заняткі гурткоў.

На працягу апошніх двух месяцаў дзеці з любоўю вывучылі жыццё і творчасць Александра Сергеевіча Пушкіна. Ва ўтульным пакоі, дзе праходзяць літаратурныя заняткі, сабраны творы Пушкіна і літаратура аб жыцці і творчасці паэта. Удзельнікі гурткоў многія творы Пушкіна вывучылі напамяць. Вучні старэйшых класаў падрыхтавалі рэфераты аб асобных этапах творчасці Александра Сергеевіча, з якімі яны выступяць на пушкінскім вечары. Зроблены мастацкія пушкінскія альбомы. У адным з іх паказана восень у творах паэта, а ў другім — зіма. (БЕЛТА).

БІБЛІЯТЭКА КАЛГАСНІКА

Калгаснік арцелі імя Валковіча, Туркаўскага сельсовета, Бабруйскага раёна, Ішанічны Нічыпар мае сваю ўласную бібліятэчку. Сярод кніжак гэтай бібліятэчкі можна знайсці выдатныя творы Пушкіна.

Ішанічны акуратна папаўняе сваю бібліятэчку новымі творамі. У гэтым годзе ён купіў «Евгений Онегин», «Руслан и Людмила», «Полтава», «Деревня», «Послание в Сибирь» і інш.

Ішанічны не толькі сам з вялікай ахвотай чытае кніжкі, але прачытанае з любоўю расказвае сваім суседзям-калгаснікам.

Алесь АЎЧЫННІК.
Іван КАПУСЦІН.

ДЗЕСЯЦЬ ЛІТГУРТКОЎ

Для вывучэння творчасці вялікага рускага паэта па калгасах Кармянскага раёна арганізавана 10 літгурткоў.

Асабліва добра наладжана праца літгуртка ў калгасе імя Розы Люксембург. Кожны вечар калгаснікі збіраюцца ў свой дом культуры газэтамі чытаюць там і гутараць пра вялікага паэта А. С. Пушкіна. Тут часта сустрэнеш 65-гадовага калгасніка Мяскаленка А., Барысенка Б., Крывастасенка А., Ісачэнка І інш.

Самы большы попыт калгаснікаў на такія творы Пушкіна, як «Цыганы», «Деревня», «Капитанская дочка».

І. Г. КАВАЛЁЎ.

Ваенна-фашысцкі мяцеж у Іспаніі

ВОЙСКІ МЯЦЕЖНІКАЎ І ІНТЭРВЕНТАЎ ЗАНЯЛІ МАЛАГУ

ПАРЫЖ, 8 лютага. (Ул. кар. «Правды»). У Парыжы атрымана паведамленне, што фашысцкія мяцежнікі ўступілі ў Малагу і што баі ідуць на вуліцах горада. Армія мяцежнікаў, якая наступае на Малагу, налічвае 60 тыс. чал. і багата снабжона артылерыяй і танкамі.

У складзе гэтай арміі знаходзяцца італьянскія часці. Некалькі дзён назад у Кадыксе высадзіліся 16 тыс. італьянскіх салдат. У ваенных дзеяннях пад Малагай прымаюць таксама ўдзел 6 маторных ваенных суднаў германскай пабудовы.

***

Фашысцкія войскі, якія значна ўзмацніліся за лік прыбыўшых новых часцей інтэрвентаў, галоўным чынам італьянскіх войск, прадпрынялі рашучае наступленне на Малагу з мора і з сушы.

У пачатку лютага часці мяцежнікаў, пасля заняцця Марбелья, падтрыманыя вялікай колькасцю артылерыі і танкаў, занялі Кольменар (20 кілометраў на поўнач ад Малагі) і працягвалі рух на Малагу. Асобныя атрады механізаваных часцей мяцежнікаў ужо 7 лютага падышлі ва ўскраін Малагі. Адначасова з мора Малага і прылягаючыя раёны падвяргаліся моцнаму артылерыйскаму абстрылу крайсерамі мяцежнікаў «Альміранта Сервера», «Канарыяс» і «Балеарэс». Дзеянні морскага флота мяцежнікаў былі ўзмоцнены германскімі і італьянскімі ваеннымі караблямі.

Апошнія блакіравалі Картахену, дзе размешчан урадавы морскі флот.

Паводле апошніх паведамленняў, італьянскім і германскім войскам удалося перамагчы ўпартае супраціўленне рэспубліканскіх часцей. Апошнія часткова адышлі на ўсход уздоўж дарогі на Тарокс і Мотрыль. Некаторая частка рэспубліканскіх войск, якая знаходзілася на захад ад Малагі і стрымлівала наступленне мяцежнікаў у сектары Марбелья, як відаць, засталася ў акружэнні і вядзе баі з праціўнікам.

Заняцце войскамі інтэрвентаў Малагі, калі весткі аб узяцці горада пацвердзяцца, значна ўскладніць становішча рэспубліканцаў на паўднёвым фронце. («Правда»).

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 8 лютага. (БЕЛТА). Агенцтва Рэйтэр паведамляе:

«У адпаведнасці з загадам вышэйшага рэспубліканскага камандвання рэспубліканскія войскі эвакуяваліся з Малагі і адступілі ў поўным парадку па новыя пазіцыі».

***

ЛОНДАН, 9 лютага. (БЕЛТА). Карэспандэнт агенцтва Рэйтэр паведамляе, што ў аперацыях пры ўзяцці Малагі на баку мяцежнікаў прымала ўдзел 20.000 італьянскіх салдат, некалькі тысяч нямецкіх салдат і мараканцаў. Мяцежнае камандванне кінула ў бой больш сотні італьянскіх танкаў. Атакай на Малагу кіраваў германскі морскі штаб, які знаходзіўся на крэйсеры «Граф Шпэе». Мяцежнікі разграмілі і разграбілі Малагу. Сотні людзей забіты. На думку іспанскіх урадавых колаў, захват Малагі мяцежнікамі не з'яўляецца сур'ёзнай стратай. Порт Малагі ўжо некалькі месяцаў не скарыстоўваўся ў якасці морскай базы. Новыя пазіцыі, занятыя ўрадавымі войскамі, скарачаюць лінію абароны і аблягчаюць апошнюю.

***

ПАРЫЖ, 9 лютага. (БЕЛТА). Як паведамляе орган радыкал-соцыялістаў «Эвр», урадавыя войскі тры дні аказвалі пад Малагай такое яраснае супраціўленне, што штаб мяцежнікаў аказаўся вымушаным зараз-жа кінуць у бой італьянскія кантынгенты, якія толькі-што высадзіліся ў Кадыксе. Першым учора ў Малагу ўступіў полк італьянцаў, затым замежны легіён і мараканцы.

***

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 8 лютага. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас паведамляе, што крэйсеры мяцежнікаў «Канарыяс», «Альміранта Сервера» і «Балеарэс» бамбардыравалі аэрадром у Монтрыле (на ўсход ад Малагі). Ёсць афіры сярод грамадзянскага насельніцтва. Каля поўдня тыя-ж судны мяцежнікаў абстрэльвалі ўзбярэжжа. Шмат афір, у прыватнасці, сярод дзяцей.

***

ПАРЫЖ, 9 лютага. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Іспаніі, рэспубліканскія войскі паспяхова прасоўваюцца на франтах Кардовы і Гранады, заняўшы Алькадел. Рэспубліканцы зараз за 8 кілометраў ад Гранады.

УПАРТЫЯ БАІ НА ПОЎДНІ АД МАДРЫДА

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 8 лютага. (БЕЛТА). Генерал Франко, разгарнуўшы атакі ў напрамку даліны ракі Харама, на паўднёвы ўсход ад Мадрыда, імкнецца перарэзаць дарогу ў Валенсію.

Учора барацьба адбывалася вакол Сан Мартын дэ ля Вега (на паўднёвы ўсход ад Мадрыда). Урадавыя войскі правялі адну за другой лініі мяцежнікаў, якія імкнуліся перайсці ў наступленне. Урадавая артылерыя інтэнсіўна бамбардыравала пазіцыі войск мяцежнікаў у сектары Сіем Посуэлос.

Позна ноччу новая атака была прадпрынята ў сектары Універсітэцкага гарадка.

Старшыня Камітэта абароны генерал Міяха аптымістычна распаўвае далейшае развіццё падзей.

Не гледзячы на прадпрынятыя мяцежнікамі адчайныя спробы перарэзаць дарогу з Валенсіі ў Мадрыд, дарога да гэтага часу знаходзіцца ў руках урадавых улад.

***

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 8 лютага. (БЕЛТА). Камітэт абароны Мадрыда апублікаваў сёння ў поўдзень паведамленне, у якім гаворыцца, што на мадрыдскім фронце прасоўванне мяцежнікаў у радзе пунктаў на поўдні ад сталіцы спынена рэспубліканцамі, якія ўмацаваліся на сваіх пазіцыях.

ПРАВАКАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ІСПАНСКІХ ТРАЦКІСТАЎ

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі, часовая рэзідэнцыя ўрада). 8 лютага. (БЕЛТА). Валенсійская комуністычная газета «Франтэ рохо» публікуе перадавы артыкул, прысвечаны забароне Камітэтам абароны Мадрыда выдання трацкісцкага лістка ў Мадрыдзе, а таксама закрыццю радыёперадатчыка «ПОУМ» (арганізацыя іспанскіх трацкістаў), які з'яўляецца нічым іншым, як рупарам генерала Франко. Газета падкрэслівае, што толькі дзеяннямі па прыкладу камітэта абароны Мадрыда можна пакласці канец гнусным выпадам «ПОУМ» на адрасу народнага антыфашысцкага фронта і компартыі ва ўсёй Іспаніі.

Камітэт абароны Мадрыда ўзяў на сябе ініцыятыву ў гэтай справе, бо зразумеў, якую падрыўную работу выконваюць трацкісты, якія палкоўваюцца пад антыфашысцкі блок.

«Маскоўскі працэс антысавецкага трацкісцкага цэнтра, — указвае далей газета, — выявіў, што тактыка і метады банды Троцкага ў СССР як дзве кроплі вады падобны на дзеянні «поумістаў» у Іспаніі...»

ВАКОЛ ГЕРМАНСКАГА ПАТРАБАВАННЯ АБ ЗВАРОЦЕ КАЛОНІЯЎ

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 9 лютага. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, адбылося пасяджэнне парламенцкага камітэта «імперскай прамысловай асацыяцыі», у склад якога ўваходзяць, галоўным чынам, члены правага крыла кансерватыўнай партыі. Камітэт большасцю ўсіх супроць аднаго прыняў рэзалюцыю, у якой катэгарычна заяўляе, што **не можа быць і гутаркі аб звароце Германіі тэрыторый, якія знаходзяцца зараз пад англійскім сцягам** (калоній, якія пасля вайны 1914—18 гг. перайшлі ў рукі Англіі), і напамінае рашучыя заявы, якія рабіліся па гэтаму пытанню адказнымі міністрамі.

Камітэт заяўляе далей аб гатоўнасці разглядзець любыя іншыя прапановы, якія маглі-б дапамагчы Германіі ў адносінах доступу да рынкаў сыравіны і харчавання.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

СЕННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО

БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР (БДТ-1)
10 лютага
СПЕКТАКЛЯ НЯМА

ДЗЯРЖ. ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР
10 лютага
ПУШКІНСКІ ВЕЧАР

Гукавы кінатэатр «Чырвоная зорка»
ДУБРОЎСКІ

Гукавы кінатэатр «Інтэрнацыянал»
ВЫПАДКОВАЯ СУСТРЭЧА

Дзіячы гукавы кінатэатр
ФЕДЗЬКА

Гукавы кінатэатр «Пролетарый»
ФЕДЗЬКА

Гукавы кінатэатр «Спартак»
ДА ПАДЗЕЙ У ІСПАНІІ
з 1 па 12 выпуск — 12 выпускаў у адзін сеанс.

Работнікі, партыйны камітэт і мясцком Цэнтральнага Камітэта комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі з жалем паведамляюць аб трагічнай смерці члена КП(б)Б—інструктара ЦК КП(б)Б тав.

Фомічава Віктара Фокіча

і выказваюць сваё глыбокае спачуванне СЯМ'І нябожчыка.

АКАДЭМІЯ НАВУК БССР
— ВЫДАВЕЦТВА —
Да стагоддзя з дня смерці вялікага рускага паэта А. С. ПУШКІНА
ВЫЙШЛА З ДРУКУ
— КНІГА —
Акад. І. І. Замоц'н—А. С. Пушк'н
НАРЫС ЖЫЦЦЯ І ТВОРЧАСЦІ.
—— Цана 3 рублі. ——
ПРОДАЖ ПРАВОДЗІЦЦА ВА ЎСІХ КНІГАРНЯХ У ГАРАДАХ І РАЁНАХ БССР.

Уп. Галоўлітбела № К—562. Друкарня газеты «Звязда» Менск Савецкая 63. К. М. С.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2